КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 21 (197)
◂ 4 ЧЭРВЕНЯ ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



ЗАКОН ШТО ДЫШЛА — Стар. 5

**СЕЦІВА Ў СЕЦІВЕ БЮРАКРАТЫІ**
Рэгуляванне інтэрнэт-прасторы — справа не толькі абсурдная ў сённяшнім свеце, але і не выгодная — Стар. 4

**ПЕРШАЯ ВІЦЭ-ЛЭДЗІ АЛЬБІЁНУ**
Уся Вялікабрытанія закахалася ў Мірыям Гансалес Дзюрантэс — жонку віцэ-прэм'ера — Стар. 11

**АДАМ ШЭМЕШ: МАСТАК І ЛІТАРАТАР** — Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**БЕЛАРУСІСТЫКА ПРАЗ 20 ГАДОЎ**
Погляд Адама Мальдзіса і Міхаіла Касцюка

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ПРЭТЭНДЭНТАЎ У ПРЭЗІДЭНТЫ ЎСЁ БОЛЬШ

Генадзь КЕСНЕР

**Хутка ў Беларусі, відаць, не застанецца ніводнай палітычнай структуры, сябры якой не заявілі б пра свой намер паўдзельнічаць у кампаніі па выбарах прэзідэнта краіны.**



Мэці Бісет Джонсан (MBJ)

Сярод тых, хто збіраецца стаць кандыдатам на пасаду кіраўніка дзяржавы, — як ужо вядомыя людзі, такі і новыя асобы, пра якіх амаль нічога не было чутно літаральна да апошняга часу.

Яшчэ раней пра свой удзел у прэзідэнцкай кампаніі афіцыйна заявілі кіраўнік Руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч, лідэр «Еўрапейскай Беларусі» Андрэй Саннікаў, былы паплечнік Аляксандра Мілінкевіча і экс-наместнік старшыні Партыі БНФ, а цяпер беспрацоўны Алесь Міхалевіч. Дарэчы, гэты малады дзеяч умудрыўся зладзіць уласную прэзентацыю не абы дзе, а ў сталічнай Ратушы. Першы раз, дарэчы, Міхалевіч заявіў журналістам пра свае прэзідэнцкія амбіцыі… у Мінскім планетарыі.

У суботу, 29 мая, свайго патэнцыйнага кандыдата ў прэзідэнты вылучыла Партыя БНФ. У гэты дзень адбыўся пазачарговы з'езд гэтай палітычнай арганізацыі. Аднак мерапрыемства праігнаравалі большасць ветэранаў-фронтаўцаў — Лявон Баршчэўскі, Віктар Івашкевіч, Вінцук Вячорка, Валянцін Голубеў, Пётра Садоўскі, іншыя вядомыя дзеячы, не згодныя з палітыкай цяперашняга фронтаўскага кіраўніцтва.

Варта адзначыць, што яшчэ ў сваю бытнасць старшынёй ПБНФ пра намер балатавацца на прэзідэнцкіх выбарах заяўляў Лявон Баршчэўскі, і ён, гледзячы па ўсім, ад таго свайго намеру не адмовіўся. Таму можа скласціся сітуацыя, калі ў спісе прэтэндэнтаў у кандыдаты ў прэзідэнты можа аказацца не толькі афіцыйна вылучаны на з'ездзе наместнік старшыні Партыі БНФ Рыгор Костусеў, але і Лявон Баршчэўскі.

Яшчэ адна адметнасць. Вельмі вялікая частка цяперашняга актыву Партыі БНФ з'яўляецца аднachасова і актывам грамадскага аб'яднання, узначаленага Аляксандрам Мілінкевічам, які збіраецца ўжо ў другі раз кінуць выклік цяперашняму кіраўніку Беларусі. Вось толькі як будуць дзейнічаць сябры БНФ, калі фактычна давядзецца рабіць выбар паміж Мілінкевічам і Костусевым, цяжка сказаць. А калі яшчэ і Баршчэўскі…

У панядзелак пра свой удзел у выбарчай кампаніі абвясціў наместнік старшыні Беларускай партыі «Зялёныя» Юры Глушакоў. У параўнанні з іншымі патэнцыйнымі кандыдатамі, пра гэтага палітыка вядома вельмі мала.

Старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Анатоль Ляўковіч паведаміў інфармацыйнаму агенцтву БелаПАН, што генеральны сакратар БСДП(Г) Мечыслаў Грыб і наместнік старшыні партыі Валеры Фралоў (генерал, былы дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу) таксама заявілі пра гатоўнасць удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах. Паводле Ляўковіча, яшчэ ў леташнім жніўні прэзідыум партыі прыняў рашэнне пра намер БСДП узяць актыўны ўдзел у прэзідэнцкай кампаніі. Ужо тады, апрача Грыба і Фралова, у якасці прэтэндэнтаў у кандыдаты называліся актывісты партыі Іван Анташкевіч і Ігар Маслоўскі.

І зноў жа ў панядзелак, 31 мая, свайго прэтэндэнта ў кандыдаты на выбары назвала Аб'яднаная грамадзянская партыя. Ад АГП у прэзідэнцкіх выбарах мае намер узяць удзел эканаміст, кіраўнік Навукова-даследчага цэнтра Мізеса, наместнік старшыні партыі Яраслаў Раманчук. Але тут асаблівасцю ёсць той момант, што Яраслаў Раманчук пойдзе на выбары ў звязцы з лідэрам АГП Анатолем Лябедзькам, які, у выпадку перамогі Раманчука на выбарах, можа заняць месца кіраўніка беларускага ўраду. Дарэчы, АГП прэзентавала сваю перадвыбарчую даволі амбітную праграму «Тысяча новых працоўных месцаў для Беларусі», з якой кандыдат ад партыі пойдзе на выбары.

Сярод іншых патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты ўжо называюць імёны сустаршыні незарэгістраванай Партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» Віталя Рымашэўскага, лідэра Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандра Ярашука, нядаўняга палітычнага вязня, удзельніка папярэдніх прэзідэнцкіх выбараў прафесара Аляксандра Казуліна, нават былога міністра замежных спраў Беларусі Пятра Краўчанкі. Хутчэй за ўсё, пойдзе на выбары і галоўны ліберал-дэмакрат краіны Сяргей Гайдукевіч, а ў тым, што сярод прэтэндэнтаў будзе імя і цяперашняга прэзідэнта, ніхто нават не сумняваецца.

На пытанне «Новага часу», чаму зноў столькі прадстаўнікоў апазіцыйнага лагера заяўляюць пра свой намер удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах, палітолаг Аляксандр Класкоўскі адказаў: «З аднаго боку, гэта можа радаваць у тым сэнсе, што апазіцыя яшчэ жывая, і, аказваецца, ёсць вельмі шмат такіх разнастайных цікавых персаналій са сваімі амбіцыямі. Але гэта калі казаць паўжартам. Насамрэч уся гэта мітусня сведчыць пра тое, што ў апазіцыі няма моцнага сцэнару і няма сапраўднай надзеі на перамогу ў гэтых выбарах. Тут не варта драконіць апазіцыю, таму што пры жорсткім аўтарытарным рэжыме апрыёры не можа быць моцнай апазіцыі, у гэтай сістэме ёй папросту не адведзена месца. За паўтара дзесяцігоддзі апазіцыю перамалолі жорны сістэмы, калі ўлада столькі гадоў мэтанакіравана працуе на яе расцярушванне пры дапамозе прапаганды, сілавых структур, спецслужб. Такі вынік варты жалю, бо сёння апазіцыя сапраўды ў вельмі расцярушаным і небаяздольным стане. Таму на гэтай кампаніі шэраг розных персаналій спрабуюць вырашыць свае прыватныя пытанні, як самараскрутка, прыцягненне нейкіх рэсурсаў. Моцнай стратэгіІ і моцнай фігуры, якая б сапраўды была здольная рэалізаваць пераможную стратэгію, пакуль што не бачна».

Тым не менш, некаторыя прадстаўнікі апазіцыйнага лагера яшчэ не пакідаюць надзеі на вылучэнне адзінага кандыдата ад дэмакратычных сіл на прэзідэнцкія выбары. Толькі часу на гэта застаецца ўсё меней.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ГЛЫБОКАЕ. ІНВЕСТЫЦЫІ ПА АТЛАСУ

Адбылася прэзентацыя інвестыцыйнага атласу. Ён падрыхтаваны інфармацыйна-кансалтынгавай установай «Беларда». Па словах аднаго з аўтараў выдання Яраслава Берніковіча, дакумент адрасаваны для патэнцыйнага інвестара, ён распавядае пра рэгіён, яго плюсы, пераконвае інвестара, чаму грошы варта ўкладаць менавіта ў Глыбоцкі раён. Гэта таксама крок тутэйшых актывістаў насустрач мясцовай уладзе дзеля росквіту раёна, якога можна дасягнуць толькі сумеснай працай.

На прэзентацыі прысутнічалі прадстаўнікі Германіі, мэр польскага горада Муравана Госліна Томаш Лэнцкі, прадстаўнікі мясцовай улады, мясцовыя актывісты, прадстаўнікі прэсы. Атлас вельмі зацікавіў замежнікаў. Ім спадабаўся горад, яго гісторыя, тое, што тут захоўваецца яго гістарычная адметнасць.

Удзельнікі выказалі спадзяванні, што такія атласы будуць выдадзены і для іншых раёнаў рэгіёна.

### ПОЛАЦК. СПРЭЧКІ ЗА ЦЭНТР ЕЎРОПЫ

Два гады таму, 31 мая 2008 года, каля паштамта ў Полацку быў урачыста адкрыты мемарыяльны знак, які пазначае месцазнаходжанне геаграфічнага цэнтра Еўропы. З гэтым не пагаджаюцца жыхары Глыбоччыны. І маюць рацыю. Паводле разлікаў беларускіх геадэзістаў, зробленых яшчэ ў 2000 годзе, цэнтральная кропка еўрапейскага кантыненту знаходзіцца ў вёсцы Івесь Глыбоцкага раёна. Ля аднайменнага возера раскінуўся невялікі сасновы гай. Пасярод яго ў свой час усталяваны геадэзічны знак, які пазначае разлічанае беларускімі геадэзістамі месцазнаходжанне геаграфічнага цэнтра Еўропы. Мясцовыя жыхары маюць надзею аднавіць справядлівасць, што дасць магчымасць развіццю турызму і эканамічнаму адраджэнню населенага пункта. У Глыбокім вельмі пашыранае меркаванне, што пераразлік быў «замоўлены» полацкай «вертыкаллю». Краязнаўца з Глыбокага Уладзімір Скрабатун лічыць, што гэта было валявое рашэнне кіраўніцтва Полацкага гарвыканкама: «Палачане забралі тое, што кепска ляжала. Вельмі дзіўна тое, што Цэнтр Еўропы апынуўся на цэнтральным праспекце, папросту насупраць гасцініцы».

### КРУЛЕЎШЧЫНА. ЗМАГАННЕ ЗА СТАТУС

Больш за 80 працэнтаў крулеўшчынскіх інтэрнэт-карыстальнікаў лічаць некарэктным называць сваё паселішча вёскай. Пра гэта сведчаць вынікі апытання, праведзенага па ініцыятыве мясцовай суполкі «ВКонтакте». Удзельнікам суполкі было прапанавана адказаць на пытанне: «Як правільна пісаць статус Крулеўшчыны на англійскай мове: town ці village?»

81 працэнт карыстальнікаў прагаласаваў за варыянт «town», бо колькасць насельніцтва і занятасць яго большасці ў транспартным і прамысловым сектары дазваляюць лічыць Крулеўшчыну гарадскім паселішчам»

Колькасць насельніцтва Крулеўшчыны на сённяшні дзень складае каля 2800 чалавек. Статуса гарадскога пасёлка, дзеля атрымання якога насельніцтва павінна быць не менш за 2000 чалавек, Крулеўшчына мае.

### БРЭСТ. СВЕТ ВАЧЫМА ДЗЯЦЕЙ

У Міжнародны дзень абароны правоў дзіцяці мясцовыя грамадскія і партыйныя актывісты зладзілі для падлеткаў імпрэзу. 17 дзяцей намалявалі на асфальце карціны, у якіх адлюстравалі сваё бачанне свету. Па заканчэнні конкурсу дзеці атрымалі прызы. Дарослыя — спецыяльныя буклеты з інфармацыяй аб правах дзіцяці. Мерапрыемства закончылася запусканнем паветраных змеяў.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

ЗВАРОТ

# ПРЫЗНАЦЬ АЗАРЫЧЫ

**Міністэрства юстыцыі Беларусі мае намер звярнуцца ў шэраг вядучых універсітэтаў Германіі для прызнання канцэнтрацыйным лагера Азарычы (Калінкавіцкі раён Гомельскай вобласці).**



Як паведамляецца на афіцыйным сайце Мінюста, ведамства мае намер больш шырока абвясціць пра злачынствы, што адбываліся ў Азарычах, у тым ліку звязаныя з наўмысным заражэннем жанчын і дзяцей тыфам. Адначасова дадаткова будуць вывучаны матэрыялы Нюрнбергскага трыбуналу, якія знаходзяцца на тэрыторыі Германіі.

Праблема прызнання канцэнтрацыйным лагера Азарычы таксама абмяркоўваецца з Міжнародным камітэтам Чырвонага Крыжа.

Міністэрства зазначае, што намаганні па прызнанні нямецкім бокам лагера Азарычы канцэнтрацыйным робіцца ўжо на працягу некалькіх гадоў. Беларусь выкарыстоўвае розныя інструменты, каб запэўніць германскі бок у тым, што лагер быў канцэнтрацыйным. Аднак МЗС і Мінфін Германіі дагэтуль не пагаджаюцца з гэтым. Прычым яны прызнаюць, што беларускім вязням Азарычаў давялося перажыць велізарныя пакуты, якія сталі вынікам злачыннай дзейнасці нацыстаў.

Мінюст звяртаўся ў Міжнародную пошукавую службу з просьбай выказаць незалежнае меркаванне наконт статусу лагера Азарычы. Прадстаўнікі гэтай арганізацыі заявілі, што не могуць прыняць рашэнне аб прызнанні лагера канцэнтрацыйным самастойна. Пры гэтым яны пагадзіліся, што ўмовы, якія існавалі ў лагеры, і яго мэта супастаўныя з характарыстыкамі канцэнтрацыйнага лагера.

Як разлічваюць у Мінюсце, прызнанню лагера Азарычы канцэнтрацыйным будзе садзейнічаць зварот у шэраг вядучых універсітэтаў Германіі, якія займаліся ў 2003–2005 гадах вывучэннем злачынстваў нацыстаў на тэрыторыі Беларусі ў гады другой сусветнай вайны і, паводле звестак Міжнароднай пошукавай службы, не ведаюць пра акалічнасці, звязаныя з лагерам Азарычы.

**Паводле БелаПАН**

СКАРГА

# З БРЭСТА Ў ААН

**У Камітэце ААН па правах чалавека зарэгістравана скарга брэсцкага пенсіянера Паўла Казлова на забарону пікета супраць абыякавасці чыноўнікаў да зваротаў грамадзян.**

Як паведаміў праваабаронца Раман Кісляк, індывідуальны зварот у камітэт заяўнік гэтага пікета 73-гадовы Павел Казлоў накіраваў у сакавіку гэтага года. Пенсіянер у сваім звароце ў структуру ААН заяўляе, што забарона Брэсцкім гарвыканкамам пікета парушае яго грамадзянскае права на свабоднае выказванне свайго меркавання.

Казлоў падаў заяўку ў Брэсцкі гарвыканкам на правядзенне пікета 27 верасня 2009 года. Ён хацеў прыцягнуць увагу жыхароў горада да існай, на яго думку, праблемы бяздушнага стаўлення чыноўнікаў да зваротаў грамадзян, а таксама парушэнняў з іх боку заканадаўства аб зваротах грамадзян.

Падставай для публічнага выказвання меркавання паслужылі 50 накіраваных Казловым зваротаў у розныя інстанцыі аб неправамерным, на яго погляд, рашэнні Міністэрства юстыцыі, на падставе якога ён у 2007 годзе быў пазбаўлены ліцэнзіі на правядзенне аўтатэхнічных экспертыз (ацэнка транспартных сродкаў). Прычынай пазбаўлення паслужыла тое, што Казлоў два разы аказаў аднаму з судоў Брэста экспертную паслугу, не названую ў ліцэнзіі. Пры гэтым заканадаўствам прадугледжваецца, што суд сваёй пастановай можа прыцягваць да такіх работ на разавай аснове грамадзян без ліцэнзіі, якія маюць спецыяльныя веды.

Усе яго звароты, лічыць Казлоў, па сутнасці не разглядаліся чыноўнікамі, а перанакіроўваліся ў іншыя арганізацыі. У канчатковым выніку яны траплялі для разгляду ў орган, які пазбавіў яго ліцэнзіі.

Мясцовыя ўлады забаранілі пікет на той падставе, што яго планавалася правесці не ў месцы, вызначаным для такіх мерапрыемстваў, якім з'яўляецца стадыён «Лакаматыў».

У сваю чаргу, як перакананы Казлоў, праводзіць на тэрыторыі «Лакаматыва» публічныя акцыі не мае сэнсу, бо прыцягнуць увагу грамадскасці ў бязлюдным месцы немагчыма.

Праваабаронца ўдакладніў, што разам са скаргай Казлова ў камітэце зарэгістраваны аналагічныя звароты чатырох брэстаўчан, якія планавалі ўзяць удзел у гэтай акцыі: а таксама Валерыя Ільяша, Сяргея Пстыгі і Марата Брашко.

**Паводле БелаПАН**

ЭКАЛОГІЯ

# ВЕРТАЛЁТ ДАСТАЛІ

**Па просьбах эколагаў прадстаўнікі грамадскага аб'яднання «Беларуская федэрацыя падводнага спорту» (БФПС) дастала з возера Рудакова, што ў нацыянальным парку «Нарачанскі», затоплены корпус верталёта Мі–2.**

Нагадаем, у пачатку 2010 года БФПС звярнулася да Мінпрыроды з просьбай дазволіць затапленне фюзеляжа верталёта Мі–2 у возеры Рудакова. У затопленым верталёце планавалася праводзіць падводныя экскурсіі, навучаць аквалангістаў і вадалазаў. З дазволу адміністрацыі нацыянальнага парка «Нарачанскі» і Мінпрыроды 26 сакавіка затапленне было праведзена.

Аднак неўзабаве пасля гэтага занепакоенасць станам возера выказалі вучоныя БДУ. Яны сцвярджалі, што з часам метал, з якога зроблены корпус верталёта, падвергнецца карозіі і прывядзе да парушэння экалогіі возера, гібелі ў ім рыбы.

У выніку праверкі Мінпрыроды былі выяўлены парушэнні прыродаахоўнага заканадаўства падчас правядзення затаплення верталёта. Фюзеляж верталёта пагнуты, фарба месцамі адстала ад корпуса, унутры яго знойдзены пабочныя прадметы. У такім выглядзе корпус верталёта ўяўляў небяспеку як для экалогіі возера, так і для здароўя аквалангістаў, зрабіў вывад спецыялісты.

Па словах Патрыкеева, БФПС пакуль адмовілася ад планаў затапіць у адным з азёраў другі няспраўны верталёт ці падобны аб'ект. Гэта мела б сэнс толькі ў вадаёме «з добрай празрыстай вадой», на што цяжка атрымаць згоду.

**Паводле БелаПАН**

СУД

# «ЭКАДОМ» СУПРАЦЬ АЭС

**16 чэрвеня ў судзе Астравецкага раёна адбудзецца судовае пасяджэнне па іску ГА «Экадом», якое патрабуе абавязаць Дырэкцыю будаўніцтва атамнай станцыі падаць дакументацыю па ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе (АУНА) будучай беларускай АЭС.**

Пра гэта паведаміў юрыст ГА «Экадом» Сяргей Магонаў па выніках папярэдняга судовага пасяджэння, якое прайшло ў судзе Астравецкага раёна 1 чэрвеня.

Нагадаем, арганізацыя мае намер дамагчыся, каб экалагічнай грамадскасці падалі дакументацыю па АУНА будучай беларускай АЭС у электронным ці друкаваным выглядзе. Гэтыя дакументы запытваліся яшчэ з лістапада 2009 года, аднак супрацоўнікі Дырэкцыі будаўніцтва АЭС адмовіліся іх падаць у належнай форме. 17 лютага яны прапанавалі эколагам прыйсці ў офіс для азнаямлення з інфармацыяй, што іх цікавіць. Пры гэтым дакументы былі даступныя толькі ў рабочы час, выносіць іх забаранялася.

Як мяркуе Магонаў, адмова падаць дакументацыю па АУНА будучай беларускай АЭС у запытаным выглядзе супрацьзаконная. Тым самым парушаны палажэнні Орхускай канвенцыі і закона аб навакольным асяроддзі Беларусі.

Паводле слоў Магонава, падчас папярэдняга пасяджэння былі прадстаўлены пазіцыі бакоў. Дырэкцыя будаўніцтва атамнай станцыі адмовілася прызнаць іск ГА «Экадом». Яе прадстаўнікі аргументавалі сваю пазіцыю тым, што сябры ГА «Экадом» усё ж маглі азнаёміцца з дакументамі ў офісе дырэкцыі. Прадстаўнікі ГА «Экадом», у сваю чаргу, настойвалі, што паводле заканадаўства маюць права на атрыманне дакументацыі па АУНА будучай беларускай АЭС у запытаным выглядзе.

Паводле слоў юрыста, у Беларусі судовае пасяджэнне з-за адмовы ў прадстаўленні дакументацыі па АУНА будучай беларускай АЭС будзе першым прэцэдэнтам, які дазволіць зафіксаваць парушэнні чыноўнікамі Орхускай канвенцыі. У выпадку прызнання слушнасці эколагаў у будучым экалагічную інфармацыю будзе атрымліваць лягчэй, мяркуе юрыст.

Як адзначыў Магонаў, пасля атрымання і вывучэння дакументацыі ГА «Экадом» можа прыняць рашэнне аб правядзенні грамадскай экалагічнай экспертызы справаздачы аб АУНА беларускай АЭС.

**Паводле БелаПАН**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# УСЁ ЯСНА, ШТО ЎСЁ ХМАРНА

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Беларусь зноў апынулася ў «падвешаным» стане. Нечым гэта нагадвае пачатак XX стагоддзя, калі бальшавікі абвясцілі знакаміты лозунг «Ні міра, ні вайны!» і заклікалі салдатаў пакінуць лінію фронту. У выніку быў заключаны Брэсцкі мір і ўзнікла неабходнасць займець сваё войска. Зараз войска ствараць не трэба — барацьба ідзе на эканамічнай прасторы.**

Напрыканцы мінулага тыдня нашымі нібыта хаўруснікамі па Мытным саюзе была агучана даволі рэзкая заява. Яны стаміліся чакаць Беларусь да сябе ў абдымкі.

Расія і Казахстан на двухбаковай аснове 1 ліпеня ўвядуць у дзеянне Мытны кодэкс Мытнага саюза, пры гэтым дакумент адкрыты для падпісання Беларуссю. Пра гэта паведаміў прэм'ер-міністр РФ Уладзімір Пуцін, які 28 мая ў Санкт-Пецярбургу сустрэўся са сваім казахстанскім калегам Карымам Масімавым. «Мы дамовіліся ўвесці ў дзеянне на двухбаковай аснове з 1 ліпеня Мытны кодэкс Мытнага саюза. Мы адкрытыя для далучэння Беларусі да ўсіх пагадненняў і рашэнняў, прынятых у межах другога этапу фармавання Мытнага саюза», — цытуе Пуціна РИА Новости.

Прэм'ер РФ таксама паведаміў, што Расія і Казахстан дамовіліся ўвесці ў дзеянне 1 ліпеня іншыя міжнародныя дамовы, што прымаюцца ў мэтах развіцця палажэнняў Мытнага кодэкса: «Намі сёння падпісаны адпаведны міжнародны дагавор, які дае магчымасць рухацца да больш глыбокай інтэграцыі, калі спатрэбіцца, на двухбаковай аснове. У падпісаным намі дакуменце вызначаны парадак прымянення на двухбаковай аснове ўсёй дагаворна-прававой базы другога этапу Мытнага саюза».

Гаворачы пра Беларусь, Пуцін заявіў: «Мы прымаем да ўвагі рознагалоссі з Беларуссю, што засталіся ў частцы парадку выплаты вывазных мытных пошлін, у тым ліку на сырую нафту, нафтапрадукты, і негатоўнасць беларускіх калег увесці раней узгодненыя мытныя пошліны і пайсці на ўвядзенне ў дзеянне другога этапу Мытнага саюза з 1 ліпеня».

Пуцін таксама заявіў, што Расія і Казахстан будуць уваходзіць у СГА ўдваіх, калі Мінск не далучыцца да дагавораў Мытнага саюза. «Як толькі Беларусь у сябе ўнутрыпраўвавыя працэдуры закончыць узгадняць, спадзяюся, у гэты ж момант дакументы падпіша, і мы будзем рухацца ў трохбаковым фармаце. Калі не адбудзецца далучэнне, будзем рухацца ўдваіх», — заявіў кіраўнік расійскага ўрада.

То бок, па меркаванні Расіі і Казахстана, Мытны саюз тармозіць выключна Беларусь. Але Беларусь не збіраецца здаваць свае пазіцыі.

Як паведаміў у Парыжы першы віцэ прэм'ер урада Беларусі Уладзімір Сямашка, афіцыйны Мінск увязвае стварэнне Мытнага кодэкса ў рамках Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі з адменай уведзенага ад 1 студзеня 2010 года расійскага экспартнага мыта на нафту і нафтапрадукты.

«Падпісанне Мытнага кодэкса павінна быць увязана з адменай мыта на нафту і нафтапрадукты. Адмена гэтага мыта для Беларусі — гэта наша жалезабетоннае патрабаванне», — сказаў Сямашка. «Калі б расійскі бок пагадзіўся адмяніць мыта хаця б ад 1 студзеня 2011 года, беларускі бок удзельнічаў бы ў перамовах 28 мая і падпісаў бы Мытны кодэкс. Але расіяне не пагадзіліся», — адзначыў ён.

**Афіцыйны Мінск увязвае стварэнне Мытнага кодэкса ў рамках Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі з адменай уведзенага ад 1 студзеня 2010 года расійскага экспартнага мыта на нафту і нафтапрадукты**

Беларускі ж кіраўнік заняў у гэтым пытанні ўвогуле ірацыянальную пазіцыю. Ён звязвае Мытны кодэкс не з выключна эканамічнымі, а з маральнымі пытаннямі. На сустрэчы з першым намеснікам старшыні ўрада Расійскай Федэрацыі Ігарам Шуваловым Аляксандр Лукашэнка заявіў: «Мы хацелі б, каб усё было прыстойна і каб любыя нашы адносіны былі заснаваныя на раўнапраўі і павазе... Калі мы гэта будзем бачыць, пойдзем на любыя кампрамісы, любыя ўступкі, якія, можа, на нейкі прамежак часу будуць і цяжкія, і адчувальныя для нас».

«Нават калі нам дзесьці будзе выгадна, але мы ўбачым ушчамленне нашых інтарэсаў і непавагу як да дзяржавы, так і да нашага народа, то мы на гэта, зразумела, не пойдзем», — сказаў Лукашэнка.

Такім чынам, галоўнае для нас — не грошы, не выгоды, датычныя Мытнага саюза, а такія абстрактныя рэчы, як «павага да народа і дзяржавы». Адзінае пытанне — хто будзе вымяраць ступень павагі да народа? Ці будзе ў нас рэферэндум з пытаннем: «Як вы лічыце, ці паважае Расія беларускі народ?» Хутчэй за ўсё, такога рэферэндуму не будзе, а Аляксандр Лукашэнка будзе карыстацца вядомым прынцыпам: «Дзяржава — гэта я».

А тым часам у Беларусі расце пратэст аўтамабілістаў. Па-першае, пакуль не вызначана, ці будуць уводзіцца мытныя пошліны на аўто, якія планаваліся з 1 ліпеня. Аўтагандляры дагэтуль знаходзяцца ў «падвешаным» стане. Самі кіроўцы абураныя коштамі на паліва.

З пачатку года бензін стаў даражэйшы на 15 працэнтаў, па меркаванні ўдзельнікаў акцыі, без бачных на тое прычын. «6 мільёнаў тон бязмытнай нафты для ўнутранага ўжытку, якія краіна атрымлівае ад Расіі, павінны прадавацца аўтамабілістам па нізкіх цэнах. Тлумачыць падвышэнне коштаў на бензін расійскімі пошлінамі нельга, бо ёсць квота для ўнутранага ўжытку», — лічаць арганізатары кампаніі.

Дарэчы, некаторыя СТА сталі прапаноўваць зніжкі ўдзельнікам акцыі на 5–10 працэнтаў.

А наперадзе — прэзідэнцкія выбары. І праз гэтыя выбары «стоп-бензіншчыкі» абавязкова ўзгадаюць Аляксандру Лукашэнку павышэнне коштаў на паліва.

Тым часам прэзідэнцкая кампанія набірае абароты. 1 чэрвеня на пасяджэнні Рады «Беларускага незалежніцкая блоку» была зацверджана працэдура абрання адзінага кандыдата. Прайшла прапанова ад БНФ. Паводле гэтай прапановы, ацэнку кандыдата будуць рабіць калегіі выбарцаў, якія мяркуецца стварыць ва ўсіх абласцях краіны і Мінску. Калегіі будуць створаныя з ліку рэгіянальных актывістаў арганізацый, якія вылучаюць свайго кандыдата. Канчатковыя ж вынікі падвядзе падліковая камісія, у якую ўвойдуць па адным прадстаўніку ад усіх суб'ектаў БНБ.

Але, здаецца, што пераможа той, хто паабяцае захаваць сённяшнія мытныя пошліны на аўто і знізіць кошт бензіну.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АЛЯКСАНДР РАДЗЬКОЎ



Міністру адукацыі Аляксандру Радзькову арганізавалі 31 мая «апошні званок». Акцыя прайшла побач з Міністэрствам адукацыі Беларусі ў Мінску. Каля дзесяці моладзевых актывістаў сталі ланцугом каля будынка і пачалі звінець у званкі для выпускнікоў. Тым самым яны хацелі паказаць, што міністру адукацыі трэба сыходзіць у адстаўку. Пры Радзькове былі ліквідаваныя профільныя класы, паменшылася колькасць гадзін выкладання замежных моў, выкінуты са школьнага курса прадмет «Сусветная мастацкая культура». Апроч таго, удзельнікі акцыі адправілі заяву з патрабаваннем адстаўкі Аляксандра Радзькова на імя міністра, то бок самога Радзькова, у Міністэрства адукацыі. Аляксандр Радзькоў быў прызначаны міністрам адукацыі ў жніўні 2003 года. За час працы на пасадзе міністра неаднойчы хадзілі чуткі пра яго магчымую адстаўку. Але чыноўнік пакуль трымаецца за свой міністэрскі партфель.

Акрамя адукацыі, спадар Радзькоў займаецца і грамадскай дзейнасцю, ці ідэалагічнай, каму як бліжэй, — ён ачольвае РГА «Белая Русь», што выступае ў падтрымку кіраўніка дзяржавы.

### МІХАІЛ ЗАХАРАЎ



Федэрацыя хакея Беларусі назвала Міхаіла Захарава («Юнацтва») трэнерам года. У заслугах трэнера — перамога клуба ў рэгулярным чэмпіянаце, плэй-оф, другое месца ў фінале Кантынентальнага кубка, а таксама заваяванне кубка краіны.

Міхаіл Захараў праславіўся пасля шэрагу скандальных заяў падчас Алімпіяды ў Ванкуверы. На зімовай Алімпіядзе нацыянальная зборная нашай краіны заняла 9-е месца. Пасля завяршэння турніру заўзятары запатрабавалі адстаўкі Захарава. Трэнер за апраўданні выдаваў абсурдныя прычыны: "Умовы падрыхтоўкі да вырашальнага матчу былі агідныімі. Спачатку ў распранальні не было крэслаў, а хакеістам даводзілася хадзіць у грамадскі туалет, які знаходзіцца дзесьці ў 50 метрах. Затым запусцілі жаночую зборную Фінляндыі. Яны без усякага сораму хадзілі аголенымі. Ад нашых гульцоў іх затуляла толькі невялікая шырма. І ўсё гэта перад вырашальным матчам. Нашы хлопцы былі ў абурэнні, ламалі клюшкі», — крытыкаваў арганізатараў беларускі трэнер. Мелі месца і неэтычныя выказванні Захарава наконт удзелу ў Алімпіядзе зборных іншых краінаў.

Захараў з'яўляецца асабістым сябрам Аляксандра Лукашэнкі, гуляе ў камандзе прэзідэнта, а таксама косіць (прынамсі, перад тэлекамерамі) траву ў рэзідэнцыі «Дразды» разам з набліжанымі да беларускага лідэра бізнесменамі.

Найлепшым варатаром Выканкам Федэрацыі хакея Беларусі прызнаў Міка Окса («Шахцёр», Салігорск), найлепшым абаронцам — Аляксея Баранава («Юнацтва», Мінск), найлепшым форвардам і найлепшым бамбардзірам — Аляксандра Мацярухіна («Юнацтва»), найлепшым форвардам абарончага плана — Аляксандра Усенку («Гомель»), найлепшым маладым хакеістам (да 20 гадоў) — Міхаіла Хараманда («Гомель»). Лепшым арбітрам назвалі Васіля Быкоўскага з «Віцебска», а лепшым стадыёнам экстралігі — «Бабруйск-Арэну».

### ІВАН БАМБІЗА



Імідж Беларусі як бульбяной краіны нанёс адчувальны ўдар... 

Імідж Беларусі як бульбянога эдэму паставіў пад сумнеў віцэ-прэм'ер ураду Іван Бамбіза. Падчас абмеркавання праблем сельскай гаспадаркі на сумесным пасяджэнні парламента віцэ-прэм'ер заявіў, што імпартаваць бульбу для Беларусі — учынак ганебны, і апраўдання яму няма. «Мы да васьмі мільёнаў тон вырабляем нашай традыцыйнай культуры. Можам і дзевяць, і дзесяць. Але на сённяшні дзень завозім бульбапрадукты: чыпсы, замарожаную бульбу, крухмал. У чым праблема? Мы не забяспечаны сучаснымі бульбасховішчамі. Іх адсутнасць прыводзіць да вялізных страт, фактычна да нерэнтабельнай вытворчасці гэтай прадукцыі. Страты могуць быць і 30%, і 50%, калі захоўваць бульбачку ў натуральных капцах. Будаўніцтва бульбасховішчаў — гэта той кірунак, які забяспечыць канкурэнтаздольнасць нашай бульбачкі».

Прайшоўся Іван Бамбіза не толькі па бульбе, але і па гародніне, якую Беларусь (з процьмай саўгасаў і аграгарадкоў) таксама імпартуе. «У нас расце і капуста, і спаржавая фасоля, і морква. Але чамусьці практычна ва ўсіх крамах — марожаныя сумесі імпартнай вытворчасці. Гэта тая прадукцыя, якую мы маглі б выраблячь самі. Гэтае здаровае харчаванне», — расказаў парламентарыям віцэ-прэм'ер, але калі ў краіне з'явіцца айчынная марожаная гародніна ў дастатковай колькасці, не паведаміў.

## НАВІНЫ ЭКАНОМІКІ

### ПАКАЗЧЫКІ БУКСУЮЦЬ

**Летась у Беларусі не былі выкананыя дзевяць асноўных паказчыкаў інавацыйнага развіцця краіны, прадугледжаных дзяржпраграмай на 2007–2010 гады.**

Так, доля новай прадукцыі ў агульным аб'ёме прадукцыі прамысловасці склала 15,4% пры плане 17%. Доля інавацыйна-актыўных арганізацый без суб'ектаў малога прадпрымальніцтва склала 12% пры плане 22,5%, доля сертыфікаванай прадукцыі ў агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці дасягнула 68,3% пры плане 69,5%.

Найбольш распаўсюджаным паказчыкам, які прымяняецца ў міжнародных параўнаннях для характарыстыкі выдаткаў на даследаванні і распрацоўкі, з'яўляецца паказчык навукаёмістасці ВУП. Развітыя краіны свету захоўваюць узровень гэтага індыкатара вышэй 2%. У Беларусі гэты паказчык захоўваецца на ўзроўні 0,8–0,7% ВУП.

Выкананне інавацыйнай праграмы раскрытыкаваў віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка. «Асобныя праекты буксуюць, сарваны тэрміны іх рэалізацыі, — заявіў на пасяджэнні прэзідыума Савета міністраў віцэ-прэм'ер. — Неабходна прыняць меры, каб поўнасцю выканаць прынятую праграму інавацыйнага развіцця на 2007–2010 гады. Гэта надзвычай актуальнае пытанне». Сёлета ў межах праграмы плануецца рэалізаваць 518 інвестыцыйных праектаў, пры гэтым да канца года ў эксплуатацыю павінна быць уведзена 399 новых вытворчасцей.

### ЛІДЭРЫ ПА РОСЦЕ ЦЭН

**Беларусь заняла сёмае месца сярод краін былога СССР па росце спажывецкіх цэн у студзені–красавіку 2010 года.**

Пра гэта сведчыць праведзены БелаПАН аналіз дадзеных нацыянальных органаў статыстыкі. У першую пяцёрку ўвайшлі Малдова, дзе з пачатку года цэны павялічыліся на 5,8%, Украіна (4,4%), Арменія (4,2%), Кыргызстан (3,8%) і Казахстан (3,6%). Далей размясціліся Расія (3,6%), Беларусь (3,1%), Азербайджан (2,9%), Грузія (2,7%), Эстонія (2,4%), Літва (1,9%), Таджыкістан (1,8%) і Латвія (1,5%).

У красавіку цэны ў Беларусі павялічыліся на 0,7%. Па гэтым паказчыку краіна раздзяліла трэцяе месца з Казахстанам. У лідэрах аказаліся Арменія (1,3%) і Латвія (0,9%). Летась Беларусь заняла другое месца сярод краін былога СССР па росце спажывецкіх цэн (10,1%; прагноз — 9–11%), у першым квартале 2010 года — дзевятае.

### НЕПАТРЭБНАЕ АБСТАЛЯВАННЕ

**Камітэт дзяржкантролю Гомельскай вобласці выявіў шматлікія парушэнні ў дзейнасці камунальнага даччынага унітарнага прадпрыемства «Рэчыцкі вінаробны завод».**

У 2003 годзе прадпрыемства набыло лінію разліву алкагольнай прадукцыі ў сувенірную бутэльку коштам 23,4 млн рублёў, але яна не была ўстаноўленая і не эксплуатавалася па прызначэнні. Паводле заключэння Гомельскага цэнтра стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі, лінія разліву не адпавядае дзеючым тэхнічным нарматыўным прававым актам, а таксама санітарным правілам і нормам для выкарыстання ў асноўнай вытворчасці.

З 2006 года прадпрыемства спыніла выпуск усіх відаў настоек, бо скончылася ліцэнзія. Вызвалілася адна лінія разліву, якая з 2008 года была законсервавана і не эксплуатавалася, у верасні мінулага года яе дэмантавалі і здалі на склад. У Камітэце дзяржкантролю прыйшлі да высновы, што належныя меры па выкарыстанні не занятага ў вытворчасці абсталявання ці яго продажу кіраўніцтва не прымала. Да таго ж кіраўніцтва завода недастаткова ўвагі надае вывучэнню рынкаў збыту, асартыменту він, што прыводзіць да павелічэння выдаткаў. Цягам 2009 года і першага квартала гэтага года прадпрыемства зліло і паўторна перапрацавала 3 892,2 тысячы дал віна, выдаткі на яго перапрацоўку склалі 15,3 млн рублёў. У красавіку на складах прадпрыемства знаходзілася 869,9 тысячы дал віна на суму 39,6 млн рублёў са скончаным тэрмінам рэалізацыі, якія таксама будуць адпраўлены на паўторную перапрацоўку.

### ГАНДАЛЬ У МІНУС

**Адмоўнае сальда знешняга гандлю таварамі ў студзені–красавіку бягучага года склала 2 млрд 63,3 млн долараў. За аналагічны перыяд мінулага года гэты паказчык складаў 2 млрд 629,7 млн долараў.**

У студзені — красавіку гэтага года аб'ём знешняга гандлю таварамі павялічыўся на 19,8% у параўнанні са студзенем — красавіком 2009 года і склаў 16 млрд 547,9 млн долараў. За гэты перыяд экспарт павялічыўся на 29,5% да 7 млрд 242,3 млн долараў, імпарт — на 13,2% (да 9 млрд 305,6 млн).

Адмоўнае сальда ў гандлі з краінамі СНД склала 1 млрд 996 млн долараў (у студзені — красавіку 2009 года — 2 млрд 709,4 млн са знакам мінус). Экспарт узрос на 51,6% да 3 млрд 772,1 млн долараў, імпарт — на 11% (да 5 млрд 768,1 млн). Аб'ём знешняга гандлю за студзень — красавік склаў 9 млрд 540,2 млн долараў (на 24,1% больш).

Знешнегандлёвы абарот з краінамі далёкага замежжа павялічыўся на 14,3% і склаў 7 млрд 7,7 млн долараў. Экспарт узрос на 11,8% да 3 млрд 470,2 млн, імпарт — на 16,9% да 3 млрд 537,5 млн. Сальда склалася адмоўнае ў памеры 67,3 млн долараў (за аналагічны леташні перыяд — плюс 79,7 млн долараў).

**Паводле БелаПАН**

УКАЗ

# СЕЦІВА Ў СЕЦІВЕ БЮРАКРАТЫІ

**Вольга ХВОІН**

**Беларускія інтэрнэт-карыстальнікі спрабуюць давесці кіраўніку дзяржавы, што рэгуляванне інтэрнэт-прасторы — справа не толькі абсурдная ў сённяшнім свеце, але і не выгодная.**



У адкрытым лісце да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай адмяніць падпісаны ім 1 лютага 2010 года ўказ № 60 «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента сеткі інтэрнэт» карыстальнікі беларускага сегменту сеціва заяўляюць, што ўказ відавочна «сыры» і мае слабыя месцы.

### Апынуцца па-за законам — проста

Аўтары ліста мяркуюць, што ўказ паўплывае на адток капіталу, бо міжнародныя кампаніі, а таксама бізнес, які не мае выразнай геаграфічнай прывязкі, будуць імкнуцца перанесці актывы за мяжу. Рэгістрацыя дробных аб'ектаў (e-mail, паддамены) запатрабуе затрат працы і часу. Указ знішчыць бясплатныя прафесійныя і аматарскія хостынгі ў Беларусі, якія даюць працоўныя месцы. «Бясплатныя хостынгі заўсёды былі адным з рухавікоў інтэрнэтызацыі масаў у Беларусі, у Расіі і свеце (narod.ru, ucoz.ru, blogspot.com і г. д.)», — падкрэсліваюць аўтары ліста. Апроч таго, яны канстатуюць, што з 1 ліпеня беспарольныя Wi-Fi кропкі будуць па-за законам, бо немагчыма праверыць пашпартныя дадзеныя тых, каго не бачыш. А, каб працягнуць аказанне паслуг, спатрэбіцца ліцэнзія. Больш таго, абсурдна, але факт, што з 1 ліпеня дазвол пакарыстацца вашай хатняй Wi-Fi сеткай сябру ці знаёмаму становіцца па-за законам.

Пад зваротам да кіраўніка дзяржавы падпісалася ўжо больш за тысячу чалавек. Для збору подпісаў у сеціве створаны адмысловы сайт, на ім сабраная інфармацыя, датычная беларускіх новаўвядзенняў у сферы рэгулявання інтэрнэту. Яго стваральнікі падкрэсліваюць, што палітычнай падаплёкі гэтая ініцыятыва не мае.

За рэгістрацыю сеціўных рэсурсаў дзяржава вызначыла плату ў памеры 0,4 базавых велічыні плюс падатак на дабаўленую вартасць, то бок 16 800 рублёў. Дакладная пазіцыя дзяржаўных органаў у адносінах да інфармацыйных інтэрнэт-рэсурсаў, сетак і сістэм, якія неабходна рэгістраваць, будзе абвешчана ў бліжэйшы час, да моманту заканчэння рэгістрацыі рэсурсаў — 1 ліпеня — ужо не зменіцца.

З гэтага ж тэрміна ўсе сайты беларускіх юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, у тым ліку і сайты дзяржаўных арганізацый, праз якія рэалізуюцца тавары, праца, паслугі на тэрыторыі Беларусі, павінны быць фізічна перанесеныя на тэрыторыю Беларусі. Акрамя таго, беларускі хостынг-правайдэр не будзе мець права выкарыстаць для аказання паслуг па хостынгу серверы, якія знаходзяцца на тэрыторыі іншых дзяржаў. Замежным хостынгам могуць карыстацца толькі прыватныя асобы, калі пры дапамозе сваіх сайтаў яны не аказваюць нейкіх паслуг, не рэалізуюць тавары і гэтак далей.

Інтэрнэт-карыстальнікі чакаюць першых вынікаў праваприменяльнай практыкі рэгулявання інтэрнэту і пазбягаюць дэталёвых прагнозаў. «Пакуль складана гаварыць, як паўплывае новаўвядзенне на байнэт. Бо нават не вядома, што канкрэтна закране заканадаўства, — гаворыць дырэктар кампаніі «Інтэрнэт-маркетынг» Аляксандр Мельнікаў. — Інтэрнэт развіваецца, і ўсё ж мусіць быць заканадаўства, якое яго рэгулюе, але паглядзі на прававую практыку. Пытанне хутчэй у размытасці фармулёвак, недасканаласці вызначэнняў. Вось з гэтым распрацоўшчыкі закона мусяць разабрацца. Увогуле, я не думаю, што мусяць быць складанасці з рэгістрацыяй юрыдычных асобаў».

У красавіку Саўмін прыняў шэраг пастаноў, што мусяць растлумачыць указ № 60, у прыватнасці пастанову № 644 ад 29 красавіка «Аб некаторых пытаннях удасканалення выкарыстання нацыянальнага сегмента глабальнай кампутарнай сеткі інтэрнэт», пастанову № 646 ад 29 красавіка «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Правілы аказання паслуг электрасувязі» і іншыя.

### Танны інтэрнэт-гандаль знікне

З 1 чэрвеня ў Беларусі пачалася рэгістрацыя ў Гандлёвым рэестры юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца розьнічным гандлем праз інтэрнэт-крамы. Суб'екты гаспадарання мусяць на працягу месяца звярнуцца ў рэгістрацыйны орган. За паслугу, якая збольшага выглядае надуманай, дзяржава атрымае немалыя грошы ў бюджэт. Так, на тэрыторыі Мінска максімальная стаўка адзінага падатку складае 1,23 млн рублёў у месяц. Прымяняецца яна да тых прадпрымальнікаў, якія гандлююць праз інтэрнэт аўта- і мотатранспартам. На вопратку са скуры стаўка складае 920 тысяч рублёў, мэблю, бытавую тэхніку, кампутары, мабільныя тэлефоны, парфумерна-касметычныя тавары, будматэрыялы — 530 тысяч, мяса, птушку, каўбасныя вырабы — 440 тысяч, хлеб, хлебабулачныя вырабы, малако і малочную прадукцыю — 200 тысяч рублёў.

Па інфармацыі ўпраўлення кантролю за індывідуальнымі прадпрымальнікамі і фізічнымі асобамі інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах, у Мінску маштабы інтэрнэт-гандлю не саступаюць гэтай жа дзейнасці ў стацыянарных аб'ектах. Выручка ІП ад розьнічных продажаў праз інтэрнэт у сярэднім у 1,5–3 разы перавышае выручку ІП, якія працуюць у стацыянарных крамах. Апошнія плацяць адзіны падатак па кожным гандлёвым аб'екце, а пры гандлі праз інтэрнэт-крамы выплачваецца адна стаўка адзінага падатку, незалежна ад колькасці інтэрнэт-крам. То напрошваецца думка, што ўлады проста захацелі ўзяць пад кантроль гэтую вольную біязнэспрастору. Сярод уладальнікаў інтэрнэт-крамаў ёсць і такія, хто прынцыпова вырашыў адмовіцца ад рэгістрацыі. «Сайт нашай арганізацыі знаходзіцца ў даменнай зоне «org», і гэтага ўжо дастаткова, каб патрапіць у катэгорыю парушальнікаў новага закону. Аднак мы прынцыпова не збіраемся пераплачваць грошы за дарагі дамен «by» і дарагі нуякасны хостынг на беларускіх пляцоўках, — гаворыць уладальнік фірмы, што гандлюе аргтэхнікай. — Такі пераход тэарэтычна быў бы магчымы пры наяўнасці бюджэтных прапаноў на беларускім хостынгавым рынку, але іх няма і ў нашай краіне аб'ектыўна быць не можа. Да таго ж, гэты закон непрафесійна пашыты грубымі ніткамі на карысць манапалістаў айчыннага ІТ-рынку і асабліва людзей у пагонах».

Ці закрануць шараговага пакупніка праблемы ўладальнікаў інтэрнэт-крамаў? Інтэрнэт-гандаль развіваўся за кошт зручнасці, аператыўнасці і, не ў апошнюю чаргу, больш танных коштаў, чым у звычайных крамах. Уладальнікі гандлёвых сайтаў не вымушаныя плаціць за арэнду памяшкання, маюць звычайна невялікі штат, то бок накладныя расходы — мінімальныя. У выніку і кошт тавару быў меншы. Натуральна, падатковыя зборы будуць уключацца ў цану тавараў, так што аматарам інтэрнэт-шопінгу варта рыхтавацца да росту цэн. Прадпрымальнікі з невялікім абаротам паспрабуюць застацца ў цяні, але гэта створыць урадлівую глебу для дзейнасці кантрольных органаў ды прымянення штрафных санкцый.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ЗАКОН ШТО ДЫШЛА

Вольга ХВОІН

**У беларускай судовай практыцы наспявае прэцэдэнт, калі за нанесеныя матэрыяльныя страты мусіць адказваць не абвінавачваемы, а яго родныя.**



На разглядзе суда Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці знаходзіцца іск гаспадароў дома ў вёсцы Прылепы (каля 20 кіламетраў ад сталіцы), якія спрабуюць даказаць, што ў Беларусі няма прававой базы, каб пазбавіць маёмасці родзічаў асуджанага чалавека і такім чынам кампенсаваць нанесеныя страты. Гісторыя гэта цягнецца не першы год і мае за сабой, як цяпер прынята казаць, спецыфічны background.

## Суд

У красавіку 2009 года суд Фрунзенскага раёна Мінска разгледзеў крымінальную справу, якую ініцыявала сталічная пракуратура з падачы кіраўніцтва ААТ «Белзнешэканамбанк». Былога кіраўніка Мінскага аддзялення № 5 ААТ «Белзнешэканамбанк» Уладзіміра Сухарукава суд прызнаў вінаватым у здзяйсненні злачынства паводле ч. 3 арт. 424 Крымінальнага кодэкса Беларусі — злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі, якое пацягнула за сабой цяжкія наступствы.

Паводле рашэння суддзі, Сухарукаў падчас выдачы і суправаджэння крэдытаў злоўжыў сваёй службовай пасадай, чым нанёс шкоду банку на суму амаль 3 мільярды рублёў. За гэта кіраўніка крэдытнага аддзела Мінскага аддзялення № 5 ААТ «Белзнешэканомбанк» пакаралі пяццю гадамі пазбаўлення волі. На момант завядзення крымінальнай справы ў лютым 2008 года Уладзімір Сухарукаў ужо больш за год як не працаваў у банку. Рэдакцыя не бярэ на сябе ролю рэвізора судовага вердыкту, аднак некаторыя моманты справы ўсё ж варта агучыць, каб чытач меў уяўленне, з якімі акалічнасцямі праходзіў працэс.

Адвакат Сухарукава ў скаргах на рашэнне суда звяртаў увагу на наступныя моманты: якую ж выгоду меў кіраўнік аддзялення банка, калі на ўмовах узаемнасці нічога не атрымаў ад займальнікаў крэдытаў і ў матэрыялах справы не было ніводнага доказу такіх фактаў? Падчас працэсу сведкі па справе — супрацоўнікі крэдытнага аддзела і аддзела прававой і кадравай работы Мінскага аддзялення № 5 ААТ «Белзнешэканамбанк» заявілі, што следства аказвала на іх ціск, і адмовіліся ад ранейшых паказанняў. Апроч таго, крэдыты, па якіх была заведзеная крымінальная справа, неаднаразова правяраліся кантралюючымі органамі і падчас працы Сухарукава, і пасля яго звальнення. Ніводная з гэтых правярак не выявіла факты парушэнняў у працэдуры выдачы крэдытаў ды іх суправаджэнні.

Абарона канстатавала і тое, што тэрмін іскавай даўнасці на момант завядзення крымінальнай справы скончыўся. Паводле Працоўнага кодэкса, для звароту наймальніка ў суд па пытаннях спагнання матэрыяльных стратаў, нанесеных работнікам, вызначаны тэрмін у адзін год са дня выяўлення ўрону. Крымінальная справа ў адносінах да Сухарукава была заведзеная па заяве банка ў лютым 2008 года. У праваахоўныя органы з прэтэнзіямі, што супрацоўнік крэдытнага аддзела нанёс шкоду працадаўцу, банк звярнуўся ў 2007 годзе, а цяперашні кіраўнік Мінскага аддзялення № 5 ААТ «Белзнешэканамбанк» Таратухін засведчыў, што, калі заступаў на пасаду ў 2006 годзе, то рэвізія выявіла страты па крэдытах.

Але ж іск у суд на спагнанне ўрону быў пададзены толькі ў сакавіку 2009 года. Чаму ўвесь гэты час банк не даваў ходу справе — застаецца нявысветленым пытаннем. Памылкова было б думаць, што юрысты банка не ведалі пра тэрміны іскавай даўнасці і тым самым падпісаліся пад сваёй некампетэнтнасцю. Суд не дапусціў у якасці сведкі эксперта МУС, які рабіў ацэнку дзеянняў Сухарукава і прыйшоў да высновы, што ён не нанёс ўрону банку.

Увагу ва ўсёй гісторыі прыцягвае момант, звязаны з пакрыццём стратаў, быццам бы нанесеных Сухарукавым банку. А дакладней, настойлівасць, з якой банк спрабуе забраць дом не непасрэдна ў Сухарукава, а ў яго родных.

## Звадка вакол дома

Яшчэ на стадыі папярэдняга расследавання ў лютым 2008 года пракуратура горада Мінска, каб забяспечыць на будучае грамадзянскі іск і магчымую канфіскацыю маёмасці, наклала арышт на дом у вёсцы Прылепы Смалявіцкага раёна, які быццам бы належаў Сухарукаву. Аднак выявілася, што жыллё належыць цёшчы Сухарукава Ларысе Севярнюк, і дом гэты яна выкупіла ў зяця яшчэ ў 1999 годзе, задоўга да распачатай крымінальнай справы.

Жонка Сухарукава — Алена — патлумачыла, што будаўніцтва сям'я распачала ў 1990-я гады. «Мы ўзялі крэдыт на будаўніцтва, аддаваць яго было проста, бо інфляцыя мела дзікі характар. Многія пабудаваліся ў той час, бо былі спрыяльныя ўмовы, — расказвае перадгісторыю Алена Сухарукава. — Але давесці да ладу дом так і не змаглі. Тады мая маці прапанавала выкупіць у нас дом, бо хацела жыць па-за горадам. У 2003 годзе яна прадала сваю кватэру ў цэнтры Мінска, і на атрыманыя грошы было завершанае будаўніцтва. Канешне, дом не малы, выглядае няекпска, але ніяк непасрэдна нам не належыць. Гэта маёмасць маёй маці, там ёсць пакой, дзе жыве з дзецьмі яе сын, калі наведваецца ў госці. Мы з мужам і сынам жылі ў непрыватызаванай кватэры ў сталіцы».

Натуральна, нерухомасць пад Мінскам — прыназная і дарагая па цяперашніх коштах. Ці не гэтым і спакусіліся ў банку? — задаецца пытаннем Алена Сухарукава.

Пасля таго, як на дом быў накладзены арышт, яго ўладальніца пачала аспрэчваць гэта рашэнне. Гарадская і Генеральная пракуратура разбіраліся са скаргамі ўласніцы, вывучылі дакументы, апыталі сведак і ўрэшце праз паўгады прыйшлі да высновы, што дом і напраўду належыць не абвінавачванаму, а Ларысе Севярнюк, і з пацвярджэннем уласніцтва таксама ўсё ў парадку. Сям'я супакоілася. «Мы былі ўпэўненыя, што адстаялі праўду, дом быў у нашым распараджэнні, мы маглі б яго перапісаць на іншага чалавека, перапрадаць, зрабіць усё, што заўгодна. Да таго ж было рашэнне пракуратуры, якое пацвярджала, што мы маем рацыю. Мы не маглі і падумаць, як будуць разгортвацца падзеі далей», — абураецца Алена Сухарукава.

У студзені 2009 года за подпісам першага намесніка старшыні праўлення банка ў суд Фрунзенскага раёна было накіраванае хадайніцтва, у якім банк зноў прасіў накласці арышт на той жа дом (падкрэслім, пракуратура зняла з яго арышт паўгода таму). Заява, падрыхтаваная юрыстам банка, мела факталагічную памылку, вакол якой і закруцілася па-новаму справа. У хадайніцтве гаварылася, што Ларыса Севярнюк засведчыла, што дом фактычна належаў яе зяцю (аднак у матэрыялах справы такіх паказанняў не было, і юрыст банка гэта ведаў), ацэнка маёмасці (толькі вонкавая) паказала, што дом быў прададзены па заніжанаму кошту, і дамова куплі-продажу ад 18.03.2008 года была складзеная для выгляду, каб у далейшым немагчыма было забраць нерухомасць у якасці кампенсацыі стратаў.

Яшчэ раз вернемся да падзей адзінаццацігадовай даўнасці: дом быў прададзены не ў 2008-м, а ў 1999 годзе. Калі спадарыня Сухарукава звярнулася ў рэдакцыю, яна прадставіла не толькі шэраг судовых скаргаў, але і дакументы, якія пацвярджаюць факт куплі-продажу нерухомасці. Натуральна, такімі ж дакументамі валодае і юрыдычная служба банка. Дык для чаго юрыст указаў у хадайніцтве памылковую дату здзелкі? Здзіўляе і тое, што суд стаў на бок банка, хаця памылка ў хадайніцтве абсалютна недарэчная і кідаецца ў вочы. Важна і тое, што паводле вердыкту суда, Уладзімір Сухарукаў хоць і быў прызнаным вінаватым у нанясенні стратаў банку, але даказаць яго асабістую выгоду абвінаваўчы бок не змог. Таму пакаранне не прадугледжвала канфіскацыю маёмасці. Валтузня вакол дома ў Прылепах — выключна ініцыятыва ААТ «Белзнешэканамбанк».

## Ці блізка да праўды

31 мая ў судзе Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці разглядаўся грамадзянскі іск Сухарукавых, якія ў чарговы раз спрабуюць даказаць, што права ўласнасці на дом у Прылепах належыць Ларысе Севярнюк. Суд апытаў сведак, суседзяў, якія пацвердзілі, што ў доме да 2006 года пражывала цёшча Сухарукава са сваім мужам. А сам Уладзімір Сухарукаў з жонкай пераехалі ў Прылепы толькі ў 2006 годзе, калі Ларыса Севярнюк цяжка захварэла. Гэтаму ёсць і пацверджанні ў выглядзе выпісак з гісторыі хваробы жанчыны і эпікрызаў.

На працэсе зноў уздымалася пытанне нездаровай увагі банка да нерухомасці. Так, адна з суседак Ларысы Севярнюк апазнала юрыста банка Гудкоўскага Аляксандра, які ў маі гэтага года прыязджаў у Прылепы пад выглядам супрацоўніка Генпракуратуры (нават з адпаведным пасведчаннем) ды распытваў іх наконт таго, што з сябе ўяўляе сям'я Сухарукавых. На гэта юрыст заявіў, што насамрэч наведваўся ў Прылепы з мэтай «разгаварыць суседзяў», а памылку у даце здзелкі куплі-продажу ў хадайніцтве аб накладанні арышту на дом назваў «чалавечым фактарам, апіскай».

Суддзя вырашыла чакаць вердыкту генеральнай пракуратуры па нагляднай скарзе па справе Сухарукава. Таму, верагодна, рашэнне суда будзе агучанае ў сярэдзіне ліпеня. Сям'і застаецца толькі працягваць змагацца з «чалавечым фактарам» юрыста ААТ «Белзнешэканамбанк».

Калі суд Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці стане на бок банка, то Беларусь займее судовы прэцэдэнт, калі блізкія вымушаныя адказваць за правіннасці сваякоў. А закон хоць і ёсць, ды ніяк не абараняе іх правы. Варыянт значна горшы за вядомую народную мудрасць, што без паперчыны ты ніхто. Выяўляецца, што не проста з паперамі, а нават з дакументамі, якія маюць юрыдычную сілу, даказаць праўду бывае вельмі не проста.

▸ ЮБІЛЕЙ

# ДУМКАЙ — У БОНЕ, ДУШОЮ — ДОМА

## ДА 80-ГОДДЗЯ УЛАДЗІМІРА САКАЛОЎСКАГА

Васіль ЯКАВЕНКА

**Чалавечы век высокі, і я думаю, акідваючы ўнутраным зрокам увесь ягоны шлях пражыты, асветны і светлы: «А ўсё ж не дарэмна ягамосць з'явіўся на нашай зямлі! Упартай працай, творчай рупнасцю ўзяў усё тое, што яму цяпер належыць».**



Дый бацькі — бацькі спрычыніліся... Свой імпэт перадалі. Найперш — Лявон Сакалоўскі, вясковы інтэлігент, актыўны дзеяч ТБШ, змагар за сваю беларускую прысутнасць на беларускай зямлі — акурат на Слонімшчыне. Як і маці Аляксандра з рэдкім і адмысловым прозвішчам — Славута, заправская гаспадыня. Спалучыўшы свае жыцці, яны далі свайму сыну Уладзіміру добры духоўны падмурак для ўзлёту.

Уладзімір вывучыўся ў Гродна на факультэце замежных моў і стаў працаваць настаўнікам, а неўзабаве здолеў і дырэктарам сярэдніх школ у Мастоўскім раёне. Малады, прыгожы, з пранікнёным позіркам вачэй, ён любіў вучняў, сваю працу, глыбей спазнаваў жыццё і свой родны кут, шкадаваў яго сыноўняй шкадобай. Разам з тым неспадзеўна і назаўжды сэрцам яго завалодала настаўніца Галіна Лукашык, абыходлівая, дакладлівая асоба, і вось ужо 55-ы год крочаць яны па жыцці разам. У іх склалася б, напэўна, звычайная прыстойная сям'я, і была б яна і самадастатковай і нават шчаслівай у рамках сонечнай савецкай рэчаіснасці, калі б не такая вось акалічнасць.

* * *

У 1962 годзе Уладзімір Лявонавіч быў накіраваны працаваць перакладчыкам у ГДР. Калі ж там ён агледзеўся, то страціў спакой — вельмі ўразіла і азадачвала, што немцы не мелі аніякага ўяўлення пра Беларусь, пра жыццё і культуру беларусаў. Тым часам па рэдкіх публікацыях пра дзеячаў беларускай культуры 1920-х гадоў (тыя публікацыі пракідваліся ў газетах і часопісах, што паступалі з ФРГ), зацікаўленаму беларусу трапіла на вока розніца ў асвятленні іх дзейнасці. Сустрэчы і размовы з нямецкім славістам Норбертам Рандавым падштурхнулі Уладзіміра Сакалоўскага да пошуку ў бібліятэках ГДР матэрыялаў пра Беларусь. Яму карцела паведаміць на радзіму, як і што пішуць пра нас іншаземцы.

Нямецкія крыніцы паказвалі на іншыя, часам зусім процілеглыя адносіны да падзей і ацэнкі асоб мінулага, і гэта яшчэ больш заінтрыгавала даследчыка, якім Уладзімір незнарок стаў. Было адчуванне, што ён патрапіў на скарб. Але ж неўзабаве ад сваіх прыяцеляў, блізкіх да афіцыйных структур у Мінску, даведаўся, што ў СССР, куды ўваходзіла яго радзіма, ягонымі пошукамі мала зацікаўлены, і тады ён звузіў свае даследаванні да літаратуразнаўчай і больш аддаленай ад палітыкі тэмы «Беларуска-нямецкія літаратурныя ўзаемасувязі перыяду Веймарскай рэспублікі (1919–1933)». Можна сказаць, што ў ягоным жыцці гэта быў пачатак новай, літаратуразнаўчай 'кар'еры».

* * *

Сярэдняга росту, не мітуслівы і раней і сёння, занепакоены ўрэшце станам свайго здароўя на другім канцы плённага шляху і па той прычыне трохі разгублены, але ж па-ранейшаму ў думках аб працы і на працы за пісьмовым сталом, ён стаіць перада мной, літаратарам, якому ахвотна і шчыра дапамагаў матэрыяламі з уласнага архіва, гэта калі я разгортваў свой раман «Надлом» у трылогію...

Скажы мне, чалавеча, звяртаюся да яго: падчас працы над інтэрпрэтацыяй беларускай літаратуры на Захадзе якія перашкоды давялося пераадолець?

І чую адказ: «Цяжкасці зносін. Калі я ўжо быў на радзіме, цяжка было мець надзейныя кантакты з зарубежнымі аўтарамі, бібліятэкамі, архівамі — за кожным тваім крокам сачылі і кожную заяўку разглядалі пад лупу. Але самым непрыемным для мяне было тое, калі з такім узрушэннем падрыхтаваная першая кніга «Пара станаўлення. Да гісторыі параўнальнага вывучэння беларускай і некаторых класічных зарубежных літаратур. 1986» тры гады праляжала ў аддзеле агітацыі і прапаганды ЦК КП(б)Б. Толькі пасля звароту туды навуковага савета Інстытута літаратуры імя Я. Купалы была перададзена ў выдавецтва. І хоць яе, урэшце, выдалі, але далей Беларусі яна нікуды не трапіла. Яе ж замаўлялі бібліятэкі Германіі. Пісаць праўду пра ўзаемадачыненні з краінамі Захаду было непапулярна і нават небяспечна. У Інстытуце літаратуры не зацвердзілі і маю наступную тэму даследаванняў «Беларуска-нямецкія літаратурныя сувязі пасляваеннага часу. 1945–1985». Замест яе была зацверджана тэма «Беларуская літаратура ў ГДР».

Меліся цяжкасці з публікацыямі. Так, «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» замовіла мне артыкул пра публікацыю Станіслава Станкевіча «Праўдзівы і сфальшаваны Янка Купала (1892–1942)», які ў ФРГ быў надрукаваны на трох мовах: беларускай, нямецкай і англійскай. Аднак жа мой допіс на старонках энцыклапедыі не з'явіўся. Тое самае сталася і з артыкулам пра Васіля Быкава «Успрыняцце і інтэрпрэтацыя творчасці Васіля Быкава на Захадзе», які быў напісаны для «Навукова-рэферацыйнага бюлетэня. Зарубежная літаратура». Нават у Інстытуце літаратуры, калі я напісаў станоўчы каментар пра дзейнасць Р. Абіхата ў час першай нямецкай акупацыі, то ён быў заменены высокаідэйным допісам іншага навуковага супрацоўніка.

Па ініцыятыве сакрэтнага аддзела пры АН БССР мне быў забаронены выезд у Капенгаген для ўдзелу ў Міжнародным сімпозіуме ЮНЕСКА «Культурныя сувязі скандынаўскіх і славянскіх краінаў у XIX і XX стагоддзях» (Капенгаген, 1984), дзе я павінен быў выступіць з дакладам «Да рэцэпцыі скандынаўскіх літаратураў у Беларусі».

* * *

Цяпер я шкадую, што напачатку гэтых нататак пра свайго калегу і прыяцеля ахарактарызаваў ягоны шлях як бы нічым не азмрочаным — «светлым». Справа ў тым, што ў першыя ж гады пасля страшэннай і лютай вайны здавалася, што шчасцейка свеціць кожнаму ў хату. Аднак на справе было далёка не так. Таму і нашаму даследчыку міжнародных культурных сувязей Уладзіміру Лявонавічу Сакалоўскаму давялося доўгі час блытацца, шукаючы выйсця з цянётаў савецкага раю.

Скажы, чалавеча, які ж перыяд у тваім напростым занятку быў найбольш спрыяльны?

«Добрым і плённым быў час, калі загадчык Славістычнага семінара Бонскага ўніверсітэта прафесар Ганс Ротэ прапанаваў мне выканаць пад яго кіраўніцтвам праект «Беларусь і Нямеччына. Інтэлектуальна-культурныя адносіны (1914–1941)». Праца над тэмай пачалася са збору дакументаў і матэрыялаў, што дало мне магчымасць на працягу амаль дзесяці гадоў актыўна працаваць у важнейшых нямецкіх архівах. Былі знойдзены многія тысячы каштоўных дакументаў. Акрамя таго, у бібліятэках Германіі ўдалося выявіць шмат неабходнага і цікавага па сувязях Беларусі і Германіі. Першы этап пошукавай працы быў закончаны выданнем на нямецкай мове «Бібліяграфіі» (Bibliographie. Weissrussland und Deutschland. Geistes- und Kulturbeziehungen 1914 und 1941). Гэта аб'ёмнае выданне на 332 старонках, якое ўтрымлівае 3694 бібліяграфічныя адзінкі па многіх галінах сумесных дачыненняў: у культуры, гісторыі, палітыцы і эканоміцы.

У прыватнасці нямецкая славістка Соня Хайл у часопісе «Zeitschrift fur Slawistik» адзначыла, што «духоўна-культурныя адносіны паміж Беларуссю і Нямеччынай да гэтага часу не сталі прадметам навуковых даследаванняў... Зараз гэты недахоп ліквідаваны выданнем грунтоўнай працы Сакалоўскага».

Аднак другі этап гэтага праекта затрымліваецца. Сабраныя і падрыхтаваныя да друку матэрыялы чакаюць у Германіі свайго часу».

* * *

Калі ў сярэдзіне 1980-х ідэалагічная блакада ўжо зменшылася, Уладзімір Сакалоўскі пашырае абсяг сваіх даследаванняў і зноў вяртаецца да назапашаных гістарычных матэрыялаў. Мне спадобілася пісаць рэцэнзію на яго кнігу «Надзвычайная місія БНР у Нямеччыне (1919–1925)» («ARCHE», №3, 2009). Цудоўнае даследаванне, якое значна дапаўняе і пашырае гісторыю Беларускай народнай Рэспублікі (Урывак з яго быў надрукаваны ў «Новым часе»). Яно таксама чакае свайго выдання асобнай кнігай.

І зноў жа, спатольваючы прагу да выяўлення мала вядомых фактаў гісторыі ды сцвярджаючы сваю даследчыцкую годнасць, Уладзімір Лявонавіч піша грунтоўную крытычную рэцэнзію на выдадзены ў Нямеччыне «Дапаможнік па гісторыі Беларусі», у складанні якога прымалі ўдзел вядомыя беларускія навукоўцы: П. Лойка, Г. Сагановіч, З. Шыбека, А. Кіштымаў, А. Каханоўскі, І. Чыквін, М. Іваноў. Іх артыкулы рэалістычна адлюстроўваюць гістарычныя падзеі на Беларусі.

Але канцэптуальная арыентацыя рэдактараў выдання Д. Байрава і Р. Лінднэра, заснаваная ў асноўным на працы польскіх, рускіх (у тым ліку савецкіх), літоўскіх і некаторых зарубежных вучоных, паслужыла таму, што беларускія гістарычныя матэрыялы былі адсунуты на другі план, праігнараваны таксама працы такіх еўрапейскіх вучоных, як А. Брукнер, Р. Абіхт, Х. Штанга, В. Концэ, А. Іпель, што чэрпалі свае высновы з першакрыніц, — усё гэта прывяло да адыходу выдання ад найбольш аптымальнага варыянту ў разглядзе гісторыі Беларусі. То была ўжо не гісторыя беларускага народа, які тварыў яе, а хутчэй гісторыя рэгіёна, дзе размешчаны беларусы. Такі падыход не даў магчымасці стварыць сапраўдны Handbuch (дапаможнік), ён хутчэй за ўсё нагадвае зборнік нарысаў па гісторыі Беларусі».

Скажы, чалавеча, чаму на Захадзе да гэтага часу ў чалавечую свядомасць яшчэ не ўвайшло, што Вялікае княства Літоўскае — калыска беларускай нацыі і культуры?

Гэта прыкра. Ці не спрабаваў ты як вучоны, прафесар пры Бонскім універсітэце, пераканаць у нечым сваіх нямецкіх калег?

«Так, сапраўды, тэндэнцыя атаясамлівання Літвы з Вялікім княствам Літоўскім як у Нямеччыне, так і ў іншых краінах Захаду ёсць. Але ж далей болей яна страчвае да сябе давер. Апошнія даследаванні ў самой Нямеччыне прафесараў Г. Ротэ, Ф. Шольца, Г. Адрыяні, а раней яшчэ Концэ, Майера і Брукнера, што засноўваюцца на вывучэнні старажытных крыніц, сведчаць пра адыход ад гістарычнай бязглуздзіцы. Пра што я неаднаразова нагадваў у сваіх артыкулах і даследаваннях.

Так... Сусветнавядомы даследчык Аляксандр Брукнер яшчэ ў 1886 годзе прааналізаваў выдатны помнік старажытнай беларускай культуры і гісторыі «Кодэкс місцэланеус з бібліятэкі графа Рачынскага ў Познані», напісаны каля 1580 года. Брукнер вызначыў крыніцы перакладу, зрабіў даволі падрабязную характарыстыку яго мовы і пераканана пісаў: «...важнейшыя характэрныя рысы мовы («Кодэксу») у гуках, формах і словах — беларускія, якія пасрэднічаюць паміж мала- і вялікарускімі, аднак ні з першымі, ні з другімі не супадаюць: калі б спатрэбілася, то можна было б толькі на аснове гэтага помніка пераканаўча даказаць самастойнасць беларускай мовы».

Брукнер назваў і характэрныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы, што існавалі ўжо ў XVI стагоддзі, — гэта поўнае вызваленне ад залежнасці царкоўнаславянскай мовы не толькі ў галіне лексікі, але і марфалогіі, ад многіх лексічных паланізмаў».

Тое, што зроблена за адно жыццё Уладзімірам Сакалоўскім, уражвае, радуе, выклікае ўдзячнасць. Я ведаю, што гэта яшчэ не ўсё, і на стале ляжыць шмат чаго незавершанага, працаёмкага і прыцягальнага. Таму жадаю табе, дарагі чалавеча, моцы ў целе і парадку ў думках і сачыненнях. Далейшага плёну!

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 7 ЧЭРВЕНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
06.05, 07.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
07.05, 08.10 Зона Х.
07.30, 08.15, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.20 У свеце матораў.
08.50 Выпускныя іспыты па матэматыцы, па рускай і беларускай мовах за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі ў агульнаадукацыйных установах.
09.05 Nota Bene.
09.35 Здароўе.
10.05 Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
11.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
12.10 Фільм-казка «Папялушка» (СССР).
13.45 «OFF STAGE LIFE».
14.05 Дак.-біяграфічны цыкл «Мая праўда».
15.15, 19.15 Навіны рэгіёна.
15.25 «Уласнай персонай».
15.55 «Культурныя людзі».
16.25 Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
17.25 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
18.20 Відэафільм АТН «Прабач мяне».
18.50, 00.40 «Зона Х». Крымінальная хроніка.
19.25 «КЕНО».
19.35 Арэна.
19.55 Ток-шоў «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.55 Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-4» (ЗША).
22.55 Шоў зорак сусветнай гімнастыкі.
00.45 Дзень спорту.

### ОНТ

06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 00.45 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.05 Контуры.
10.10 «Дыханне планеты».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 01.00 Навіны спорту.
11.10 «Мікі Маўс. Хатні клуб».
11.30 «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
12.00 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Прабачыць».
13.40 «Модны прысуд».
14.45 «Кантрольны закуп».
15.15 Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышку». Шматсерыйны фільм.
16.15 «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
18.20 Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
19.00 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 Ток-шоў «Выбар».
22.00 «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм. V-ы сезон. 2-я серыя.
23.20 «Злачынствы стагоддзя».
23.55 Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».

### СТВ

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
06.10 «Міншчына».
06.20 «Раніца.Студыя добрага настрою».
07.40 «СТБ-спорт».
08.30 «Тыдзень».
09.35 «Вялікі сняданак».
10.05 «Пяць гісторый».
10.40 «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
11.40 «Званая вячэра».
12.35 «Мачаха». Серыял.
13.50 «Зорны рынг».
15.00 «Вялікі горад».
15.40 «Далёкія сваякі».
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Добра пажаліцца».
17.10 «Наша справа».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.30 «Мачаха». Серыял.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10 «СТБ-спорт».
20.20 «Добры вечар, маляня».
20.35 Фільм «Таямнічая выспа». Украіна.
22.55 «Сталічны футбол».
23.25 Фільм «Дзеці шпіёнаў 2: выспа надзей, што не спраўдзіліся». ЗША, 2002 г.

### ЛАД

07.00 ЛАДная раніца.
08.00 Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
08.30 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
09.30 У гэты дзень.
09.35 Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
10.35 Меладрама «Да заўтра» (Італія).
12.20 «Пра мастацтва».
12.50 Школа рамонту.
13.45 Серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
14.35 Бухта капітанаў.
15.15 Тэлебарометр.
15.30 Дэтэктыў «Ланцуг» (Расія).
16.25 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
17.25 Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
18.00 Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
19.00 Містычны дэтэктыў «Бухта страху» (Расія). 1-я серыя.
20.00 Беларуская часіна.
21.00 Калыханка.
21.20 Камедыйны серыял «Універ» (Расія).
21.55 Дэтэктыў «Ланцуг» (Расія).
22.40 Камедыя нораваў «Фердынанд і Караліна» (Італія- Францыя).

### РОССИЯ

07.00 «Раніца Расіі».
09.25 Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
10.20 «Ранішняя пошта».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25 «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
12.15 Тэлесерыял «Дзве сястры-2». Расія.
13.05 «Пакой смеху».
13.50 Навіны - Беларусь.
14.25 Прэм'ера. «Сустрэча». Дак. фільм.
15.10 Фільм «Сюрпрыз». Расія, 2009 г.
16.50 Навіны - Беларусь.
17.15 «Кулагін і партнёры».
17.50 Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.30 Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
20.25 Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
22.20 Прэм'ера. Тэлесерыял «Дворык».
22.55 «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
23.50 «Нічога асабістага».
00.05 Навіны - Беларусь.
00.15 «Весткі+».
00.35 «Дзяжурны па краіне».

### НТВ

07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
07.05 Канал «Сёння раніцай».
08.25 «Праграма Максімум».
09.20 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
10.20 «Сярэдні клас».
10.55 «Кулінарны паядынак».
11.55 Серыял «Вярнуць на даследаванне».
13.30 Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
14.15 Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
15.05 «Выратавальнікі».
15.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
18.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.35 Вострасюжэтны серыял «Дзікі».
21.40 Серыял «Час Волкава».
23.25 Сёння.
23.50 «Сумленны панядзелак».
00.40 «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

09.35 Аўтаспорт. Аўтагонкі Ле-Ман. Ле-Кастэле (Францыя). Агляд.
10.30 Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Парыж (Францыя). Мужчыны. Фінал.
11.30 Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
12.00 Футбол. Кубак свету 2010. ПАР. Таварыскі матч. Агляд.
13.00 Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
13.30 Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Парыж (Францыя). Мужчыны. Фінал.
14.30 Тэніс. Турнір АТР. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Дзень 1.
16.00 Веласпорт. Францыя. Этап 1.
17.30 Тэніс. Турнір АТР. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Дзень 1.
20.30 Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 хвіліны Ле-Мана. Францыя.
21.00 Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
21.15 Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. ПАР. Часопіс.
21.50 Весь дык так!!!
22.00 Пра рэстлінг. Агляд WWE.
22.30 Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
23.30 Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
23.45 Футбол. Госць тыдня. Часопіс.
00.00 Футбол. Кубак свету 2010. ПАР. Таварыскі матч. Агляд.
01.00 Ралі. Сусветны тур па ралі рэйду. Эштарыл (Партугалія)/Маракеш (Марока). Этап 2.
01.30 Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
01.45 Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 хвіліны Ле-Мана. Францыя.
02.15 Весь дык так!!!

### БЕЛСАТ tv BELSAT

07.00 Тыдзень у «Аб'ектыве».
07.30 Гісторыя пад знакам Пагоні.
07.40 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
07.55 Акно ў Еўропу.
08.25 Дакументальная гадзіна: «Галерэя Ады», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
09.15 Вагон.
09.20 «Арол: крымінальная сага», серыял.
10.20 Басанож па свеце.
10.45 Фільматэка майстроў: «Так знянацку», маст. фільм, 2002 г., Аргентына–Галандыя.
17.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
17.05 «На поўных абаротах», серыял.
17.30 «Арол: крымінальная сага», серыял.
18.10 Аўтастопам праз Еўропу: «Польшча».
18.50 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
19.10 Гісторыя пад знакам Пагоні.
19.25 «Аблавушак», мультсерыял.
19.35 Еўропа сёння.
20.05 Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Заўчасны падарунак», дак. фільм, Польшча.
21.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
21.25 Прыватная калекцыя.
21.45 «Тыдзень з жыцця мужчыны», маст. фільм, 1999 г., Польшча.
23.10 Аб'ектыў.

## 8 ЧЭРВЕНЯ, АЎТОРАК

### 1

06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
06.05 Дзень спорту.
06.10, 07.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
07.05, 08.10 Зона Х.
07.30, 08.15, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.20 Арэна.
08.45 Выпускныя іспыты па беларускай і рускай мовах, па матэматыцы за перыяд навучання на ўзроўні агульнай базавай адукацыі ў агульнаадукацыйных і спецыяльных установах.
09.05 Меладрама «Сівер», закл. серыя.
09.55 Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
10.55 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
11.40 Відэафільм АТН «Шаркаўшчынская мара» цыклу «Зямля беларуская».
12.10 Прэм'ера. Камедыйная меладрама «Жонка па кантракце» (Расія).
14.05 Ток-шоў «Ход у адказ».
15.15, 19.15 Навіны рэгіёна.
15.25 Відэафільм АТН «Заступніца зямлі беларускай».
15.55 Серыял «Генеральская ўнучка».
16.50 Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
17.50 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
18.50, 00.25 «Зона Х». Крымінальная хроніка.
19.25 «КЕНО».
19.30 Сфера інтэрэсаў.
19.55 Прэм'ера. Меладраматычны серыял «Жыццё, якога не было...» (Расія). 1-я серыя.
21.00 Панарама.
21.55 Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-4» (ЗША), закл. серыя.
22.55 Трылер «Незнаёмцы» (ЗША).
00.40 Дзень спорту.

### ОНТ

06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15, 01.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.05 Чакай мяне.
10.00 Гарады-героі. Севастопаль.
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.30 Навіны спорту.
11.10 «Мікі Маўс. Хатні клуб».
11.30 «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
12.00 «Малахаў +».
13.10 «Зразумець. Прабачыць».
13.40 «Модны прысуд».
14.45 «Кантрольны закуп».
15.15 Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышку». Шматсерыйны фільм.
16.15 «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
17.05 «Хай кажуць».
18.20 Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
18.55 «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
20.00 Час.
21.05 Прэм'ера. «Ярмолавы». Шматсерыйны фільм.
22.10 Прэм'ера. «Выклік-3». Шматсер. фільм.
23.35 «Зваротны адлік».
00.10 Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».
01.15 Навіны спорту.

### СТВ

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
06.10 «Міншчына».
06.20 «Раніца.Студыя добрага настрою».
07.40 «СТБ-спорт».
08.30 Фільм «Таямнічая выспа». 2008 г.
10.05 «Пяць гісторый».
10.40 «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
11.40 «Званая вячэра».
12.35 «Мачаха». Серыял.
13.50 «Гучная справа».
14.40 «Свая каманда». Моладзевы серыял.
15.40 «Ваенная таямніца».
16.50 «Сталічны футбол».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.30 «Мачаха». Серыял.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, маляня».
20.25 Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
21.30 Прэм'ера! «Чэркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
22.55 «Рэпарцёр СТБ».
23.25 «Аўтапанарама».
23.45 Фільм «Пчолы-забойцы». Германія.

### ЛАД

07.00 ЛАДная раніца.
08.00 Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
08.30 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
09.25 У гэты дзень.
09.30 Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
10.35 Дэтэктыў «Бухта страху». 1-я серыя.
11.30 «Запал па культуры».
12.10 Дак.-пазнавальны фільм «Таямніцы пячоры ляніўцаў-гігантаў» (Францыя).
13.10 Камедыйна-дакументальны серыял «Гісторыя жартуе» (ЗША-Канада).
13.35 Серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
14.30 Мультфільм.
14.50 Свая кампанія.
15.30 Серыял «Ланцуг» (Расія).
16.20 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
17.25 Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
18.00 Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
19.00 Містычны дэтэктыў «Бухта страху» (Расія). 2-я серыя.
20.00 Беларуская часіна.
21.00 Калыханка.
21.20 Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
21.55 Спорт-кадр.
22.20 Серыял «Ланцуг» (Расія).
23.10 Дэтэктыўны трылер «Лютасць» (ЗША).

### РОССИЯ

07.00 «Раніца Расіі».
09.20 Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
10.10 «Прыгажосць па-савецку. Лёс манекеншчыцы».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25 «Нічога асабістага».
11.40 «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
12.30 Тэлесерыял «Дзве сястры-2». Расія.
13.50 Навіны - Беларусь.
14.25 «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
15.15 Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
16.50 Навіны - Беларусь.
17.15 «Кулагін і партнёры».
17.50 Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.30 Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
20.25 Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
22.20 Прэм'ера. Тэлесерыял «Дворык».
22.55 «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
23.50 Навіны - Беларусь.
00.00 «Весткі+».
00.20 «Бярмудскі трыкутнік. Логава д'ябла». Дакументальны фільм.

### НТВ

07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
07.05 Канал «Сёння раніцай».
08.25 «І зноў добры дзень!».
09.15 «Чыстасардэчнае прызнанне».
10.20 «Сярэдні клас».
10.55 «Кватэрнае пытанне».
12.00 Серыял «Вярнуць на даследаванне».
13.30 Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
14.20 Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
15.10 «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
15.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.35 Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
18.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.35 Вострасюжэтны серыял «Дзікі».
21.40 Серыял «Час Волкава».
23.25 Сёння.
23.50 «Галоўны герой прадстаўляе…».
00.35 «Фатальны дзень».

### EUROSPORT

09.30 Дзюдо. Турнір Вялікага шалома. Рыа-дэ-Жанэйра (Бразілія).
10.00 Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 хвіліны Ле-Мана. Францыя.
10.30 Аўтаспорт. Гонкі Ле-Ман. 1000 км. Спа-Франкашам (Бельгія). Агляд.
11.30 Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
11.45 Веласпорт. Францыя. Этап 1.
13.00 Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Італія. Часопіс.
13.30 Тэніс. Турнір АТР. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Дзень 1.
14.30 Тэніс. Турнір АТР. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Дзень 2.
16.00 Веласпорт. Францыя. Этап 2.
17.30 Тэніс. Турнір АТР. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Дзень 2.
20.30 Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 хвіліны Ле-Мана. Францыя.
21.00 Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
21.15 Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Італія. Часопіс.
21.45 Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
22.15 Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBA.
00.00 Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Брно (Чэхія). Агляд.
00.30 Ралі. Ралійная серыя IRC. Сардзінія (Італія). Агляд.
01.00 Ралі. Сусветны тур па ралі рэйду. Эштарыл (Партугалія)/Маракеш (Марока). Этап 3.
01.15 Матаспартыўны часопіс.
01.30 Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
01.45 Весь дык так!!!
02.00 Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 хвіліны Ле-Мана. Францыя.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

07.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
07.20 Еўропа сёння.
07.50 Прыватная калекцыя.
08.10 Моўнік (лінгвістычная праграма).
08.15 Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
08.35 Аўтастопам праз Еўропу: 1 серыя, «Польшча».
08.50 Гісторыя пад знакам Пагоні.
09.00 «Мент», дэтэктыўны серыял, Польшча.
09.50 «На поўных абаротах», серыял.
10.10 Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Заўчасны падарунак», дак. фільм, Польшча.
11.05 «Тыдзень з жыцця мужчыны», маст. фільм, 1999 г., Польшча.
17.00 Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
17.05 «На поўных абаротах», серыял.
17.25 «Ідэальны жыхар», трылер, ЗША.
19.00 Госць «Белсату»: Алесь Камоцкі.
19.20 «Аблавушак», мультсерыял.
19.35 Праект «Будучыня».
20.00 «Галерэя Ады», дак. фільм, Беларусь.
21.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
21.20 «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
22.05 YoLife! (моладзевая праграма).
22.20 Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 9 ЧЭРВЕНЯ, СЕРАДА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Серыял «Жыццё, якога не было...».
**09.55** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**10.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «Экспрэсам праз Лунінеччыну» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Прэм'ера. Меладрама «Калі мы былі шчаслівыя» (Расія). 1-я серыя.
**14.05** «Альманах вандраванняў».
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Еўрабачанне 2010. за кадрам».
**15.55** Серыял «Генеральская ўнучка».
**16.50** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.55** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** «Зямельнае пытанне».
**19.55** Меладраматычны серыял «Жыццё, якога не было...» (Расія). 2-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Крымінальная драма «24 гадзіны» (Германія-ЗША).
**00.00** Серыял «Часткі цела-5». 1-я серыя.
**01.00** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15, 01.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Выклік-3». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.30, 01.15** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**21.05** Прэм'ера. «Ярмолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Выклік-3». Шматсер. фільм.
**23.35** «Дакументальны дэтэктыў».
**00.10** Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.35** «Чэркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Чэркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**22.55** «Мінск і мінчане».
**23.25** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.50** Фільм «Пекла». Германія, 2008 г.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Містычны дэтэктыў «Бухта страху» (Расія). 2-я серыя.
**11.30** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.10** Спорт-кадр.
**12.40** Камедыйна-дакументальны серыял «Гісторыя жартуе» (ЗША-Канада).
**13.10** Мультфільм.
**13.40** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.35** «Лабірынты: маёнтак Талстых у Беларусі».
**15.05** Медычныя таямніцы.
**15.30** Вострасюжэтны серыял «Ланцуг».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Містычны дэтэктыў «Бухта страху».
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**21.55** Вострасюжэтны серыял «Ланцуг».
**22.40** Камедыя «Залаты ключык» (Расія).

---

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Фальшываманетчыкі. Геніі і злыдні». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**12.15** Тэлесерыял «Дзве сястры-2». Расія.
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармэліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
**22.20** Прэм'ера . Тэлесерыял «Дворыкі».
**22.55** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** «Казачныя прыгажуні. Жыццё пасля славы». Дакументальны фільм.

---

НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Следства вялі…».
**09.20** «Іх норавы».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «Дачны адказ».
**11.55** Серыял «Вярнуць на дасьледаванне».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**14.15** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**15.05** «Галоўная дарога».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Вострасюжэтны серыял «Дзікі».
**21.40** Серыял «Час Волкава».
**23.25** Сёння.
**23.50** «Позняя гутарка».
**00.35** «Першая кроў».

---

EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 хвіліны Ле-Мана. Францыя.
**10.00** Ралі. Сусветны тур па ралі рэйду. Эштарыл (Партугалія)/Маракеш (Марока). Этап 3.
**10.15** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Брно (Чэхія). Агляд.
**10.45** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
**11.00** Тэніс. Турнір ATP. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Дзень 2.
**12.00** Веласпорт. Францыя. Этап 2.
**13.00** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**13.30** Тэніс. Турнір ATP. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Дзень 2.
**14.30** Тэніс. Турнір ATP. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Дзень 3.
**16.00** Веласпорт. Францыя. Этап 3.
**17.30** Тэніс. Турнір ATP. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Дзень 3.
**20.30** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 хвіліны Ле-Мана. Францыя.
**21.00** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
**21.15** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Краіны Афрыканскага кантынента. Часопіс.
**21.45** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**22.20** Конны спорт. Кубак нацый. Сант Гален (Швейцарыя).
**23.20** Навіны коннага спорту.
**23.25** Гольф. Тур PGA. The Memorial Tournament. Дублін (Агайо/ЗША).
**00.25** Гольф. Еўратур. Жанчыны. Адкрыты чэмпіянат ABN Amro. Ратэрдам (Нідэрланды).
**00.35** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.40** Яхт клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.45, 02.15** Вось дык так!!!
**01.00** Ралі. Сусветны тур па ралі рэйду. Эштарыл (Партугалія)/Маракеш (Марока). Этап 4.
**01.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
**01.45** Алімпійскі часопіс.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Госць «Белсату»: Алесь Камоцкі.
**08.05** YoLife! (моладзевая праграма).
**08.20** «Галерэя Ады», дак. фільм, Беларусь.
**09.15** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**10.00** «На поўных абаротах», серыял.
**10.25** «Ідэальны жыхар», трылер, 1999 г., ЗША.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «На поўных абаротах», серыял.
**17.35** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**18.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.25** «Дзень Волі», дак. фільм, Беларусь.
**18.55** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.10** Хто ёсць кім?: Кастусь Шыдлоўскі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** На колах.
**20.05** Прыватная калекцыя.
**20.25** Героі не нашага часу: Уладзімір Парфяновіч. Звычка перамагаць.
**20.45** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Шыралі – ноша клопату», маст. фільм, 1986 г., Аўстралія.
**22.50** Аб'ектыў.

## 10 ЧЭРВЕНЯ, ЧАЦВЕР

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.35, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.40** «Зямельнае пытанне».
**09.05** Меладраматычны серыял «Жыццё, якога не было...» (Расія). 2-я серыя.
**09.55** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Меладрама «Калі мы былі шчаслівыя» (Расія). 2-я серыя.
**13.55** Дак. цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**14.35** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Уласнай персонай.
**15.55** Серыял «Генеральская ўнучка».
**16.50** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 01.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Меладраматычны серыял «Жыццё, якога не было...» (Расія). 3-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** «Актуальнае інтэрв'ю».
**22.05** Баявік «Ніколі не здавайся» (ЗША).
**00.20** Вострасюжэтны серыял «Часткі цела-5» (ЗША). 2-я серыя.
**01.15** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Выклік-3». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Мікі Маўс. Хатні клуб».
**11.30** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.30** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Тата на ўсе рукі».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ярмолавы». Шматсерыйны фільм.
**22.10** «Выклік-3». Шматсер. фільм.
**23.15** Нашы навіны.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** АНТ прадстаўляе: «Выбар +».
**00.05** Шматсерыйны фільм «Тая, што размаўляе са зданямі».
**00.55** Нашы навіны.
**01.10** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**09.30** «Я-вандроўца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Чэркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Чэркізона. Аднаразовыя людзі» Серыял.
**22.55** «Асабісты інтэрас».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «Як рыбка без вады». Францыя, 1999 г.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Містычны дэтэктыў «Бухта страху» (Расія). 3-я серыя.
**11.30** Экспедыцыя.
**12.00** Бітва экстрасэнсаў.
**13.00** Камедыйна-дакументальны серыял «Гісторыя жартуе» (ЗША-Канада).
**13.25** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.20** Мультфільм.
**14.50** Жывы гук.
**15.30** Серыял «Ланцуг» (Расія). Закл. серыя.
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Містычны дэтэктыў «Бухта страху» (Расія). 4-я серыя.
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.20** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**21.55** Час футболу.
**22.25** Серыял «Ланцуг» (Расія). Закл. серыя.
**23.10** Культасвет.

---

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Галоўны індзеец краіны Саветаў. Гойка Міціч». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**12.15** Тэлесерыял «Дзве сястры-2».
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Кармэліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
**22.20** Прэм'ера - 2010. Тэлесерыял «Дворыкі».
**22.55** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** «Містэрыя жыцця. Народны мастак Ілля Глазуноў». Дакументальны фільм.

---

НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.25** «Лепшы горад Зямлі».
**09.15** «Жаночы погляд».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Вочная стаўка».
**11.40** Серыял «Вярнуць на дасьледаванне».
**12.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**14.15** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Вострасюжэтны серыял «Дзікі».
**21.40** Вострасюжэтны серыял «Час Волкава».
**23.25** Сёння.
**23.50** «Асабліва небяспечны!».

---

EUROSPORT

**09.35** Конны спорт. Кубак нацый. Сант Гален (Швейцарыя).
**10.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
**10.45** Тэніс. Турнір ATP. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Дзень 3.
**12.00** Веласпорт. Францыя. Этап 3.
**13.00** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. ПАР. Часопіс.
**13.30** Тэніс. Турнір ATP. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Дзень 3.
**14.30** Тэніс. Турнір ATP. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Дзень 4.
**16.00** Веласпорт. Францыя. Этап 4.
**17.30** Тэніс. Турнір ATP. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Дзень 4.
**20.30** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 хвіліны Ле-Мана. Францыя.
**21.00** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле-Мана. Кваліфікацыя. Францыя.
**22.00** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
**22.30** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**23.00** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле-Мана. Кваліфікацыя. Францыя.
**01.00** Ралі. Сусветны тур па ралі рэйду. Эштарыл (Партугалія)/Маракеш (Марока). Этап 5.
**01.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
**02.00** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 хвіліны Ле-Мана. Францыя.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.20** На колах.
**07.50** Прыватная калекцыя.
**08.10** Героі не нашага часу: Уладзімір Парфяновіч. Звычка перамагаць.
**08.25** Невядомая Беларусь: «Дзень Волі», дак. фільм, 2008 г. Беларусь.
**08.50** «На поўных абаротах», серыял.
**09.15** Беларусы ў Польшчы.
**09.30** «Шыралі – ноша клопату», маст. фільм, 1986 г., Аўстралія.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Папялушка», тэлесерыял, 2006 г.
**17.30** «Шыралі – ноша клопату», маст. фільм, 1986 г., Аўстралія.
**19.00** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.05** «Канцавы прыпынак», дак. фільм, 2007 г., Венгрыя–Фінляндыя.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Згрaя», сенсацыйны серыял.
**22.15** «Обчына», дак. фільм, 2007 г., Румынія.
**23.35** Аб'ектыў.

## 13 ЧЭРВЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**07.50** Мультфільмы «Русалачка», «Дзюймовачка» (СССР).
**08.50** Слова Мітрапаліта Філарэта на дзень Сабора Беларускіх Святых.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** «Альманах вандраванняў».
**10.20** «Культурныя людзі».
**10.55** «У свеце матораў».
**11.30** «Nota Bene».
**12.10** Прыгодніцкі баявік «Ход у адказ» (СССР).
**13.50** «Любімы небеларускі акцёр». Дакументальны фільм (Беларускае тэлебачанне).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Т-чалавек: закаханы ў рызыку».
**16.00** Лірычная камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць» (Расія).
**17.50** Суперлато.
**18.45** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**19.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.55** «КЕНО».
**20.00** «У цэнтры ўвагі».
**21.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Германія - Аўстралія. Прамая трансляцыя.
**23.25** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

### Н

**07.00** Нядзельная раніца.
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2008 год.
**09.55** Камедыя «Каўказская палонніца, або Новыя прыгоды Шурыка».
**11.25** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.00** «Разумніцы і разумнікі».
**12.45** «Маленькі прынц». Дабрачынная акцыя «Падаруй жыццё!».
**14.35** «Песні Перамогі».
**15.05** Севастопальскія аповяды.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Тэорыя неверагоднасці.
**16.55** Фільм «Залатая клетка».
**18.55** Прэм'ера АНТ: «Давай ажэнімся!».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.10** Меладрама «Спытай у пылу».
**00.20** Баявік «Егер».

### ТВ

**07.15** «Афрамасквіч - 2». Камедыйны серыял.
**08.05** Фільм «А вы кахалі калі-небудзь?». СССР, 1973 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Вар'яцкі дзень інжынеры Баркасава». СССР, 1983 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёр СТБ».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Прызнанні небяспечнага чалавека». ЗША - Канада - Германія, 2002 г.
**22.45** «Прафесійны бокс».
**23.40** Фільм «Містэр адзінота». ЗША - Францыя - Вялікабрытанія - Ірландыя, 2007 г.
**01.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### Лад

**07.25** Дабравест.
**07.50** Мір вашай хаце.
**08.00** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.25** Дакументальны фільм «Вандраванне па Эльзасе» (Францыя).
**09.20** Нашы тэсты.
**10.00** Школа рамонту.
**11.00** Медычныя таямніцы.
**11.45** Мультфільм.
**11.50** Бухта капітанаў.
**12.30** «Правы чалавека».
**12.45** Кінааповесць «Вячэрні звон» (Расія).
**14.25** Футбол. Чэмпіянат свету. Алжыр-Славенія. Прамая Трансляцыя.
**16.25** Жаночая ліга.
**16.55** Футбол. Чэмпіянат свету. Сербія-Гана. Прамая трансляцыя.
**18.55** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**19.45** Смешная часіна.
**20.20** Тэлебарометр.
**20.40** Экспедыцыя.
**21.10** Вострасюжэтная меладрама «Лясун. Працяг гісторыі» (Расія). Закл. серыі.
**23.10** Кінаспробы.
**23.30** «Час футболу». Чэмпіянат свету-2010.
**00.10** Свая музыка. Працяг.

### РОССИЯ

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** Музычная камедыя «Вясёлыя рабяты».
**08.50** Мультфільмы.
**09.05** Фільм «Надзея як сведчанне жыцця». 2007 г.
**12.10** Фільм «Сем нявест яфрэйтара Збруева».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Песня года». Частка другая.
**17.05** Фільм «Дрэсіроўшчыца тыграў».
**19.00** Весткі.
**19.25** Меладрама «Шчасце па рэцэпце».
**21.35** Прэм'ера. Фільм «Віват, Ганна!». Расія, 2008 г.
**01.05** Канцэрт.

### НТВ

**07.30** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.25** «Першая кроў».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прыгодніцкая камедыя «Макасіны Маніту».
**15.00** Фільм «Дачніца». 1-я серыя.
**16.00** Сёння.
**16.20** Фільм «Дачніца». 2 -я серыя.
**17.15** «І зноў добры дзень!».
**18.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.45** «Бульдог-шоў».
**21.40** Вострасюжэтны серыял «Мент у законе».

### EUROSPORT

**04.00** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле-Мана. Францыя.
**10.00** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 хвіліны Ле-Мана. Францыя.
**10.30** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле-Мана. Францыя.
**11.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
**12.00** Веласпорт. Францыя. Этап 6.
**13.00** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**13.30** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Італія. Часопіс.
**14.00** Футбол. Кубак свету 2010. Навіны.
**14.10** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле-Мана. Францыя.
**16.00** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 хвіліны Ле-Мана. Францыя.
**16.30** Футбол. Кубак свету 2010. Навіны.
**16.40** Тэніс. Турнір ATP. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Фінал.
**18.15** Веласпорт. Францыя. Этап 7.
**19.00** Футбол. Кубак свету 2010. Навіны.
**19.15** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**19.45** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**20.15** Футбол. Кубак свету 2010. Навіны.
**20.30** Аўтаспорт. Аўтагонкі. 24 хвіліны Ле-Мана. Францыя.
**21.00** Футбол. Кубак свету 2010. Навіны.
**21.10** Тэніс. Турнір ATP. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Фінал.
**22.00** Бокс. Турнір Super Six. ЗША.
**23.30** Футбол. Soccer City. Йоханэсбург (ПАР).
**00.00** Ралі. Сусветны тур па ралі рэйду. Эштарыл (Партугалія)/Маракеш (Марока). Этап 8.
**00.30** Мотаспартыўны часопіс.
**00.45** Веласпорт. Францыя. Этап 7.
**01.30** Тэніс. Турнір ATP. Queen's (Лондан/Вялікабрытанія). Фінал.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.55** «Бяссонныя плыні», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**08.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**08.40** Чалавек-эпоха: «Маргарэт Тэтчэр – дзяцінства правадыркі», дак. фільм, 2008 г., Францыя.
**09.35** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.00** Аблавушак», мультсерыял.
**10.25** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**11.10** «Уцёкі ад закону. Падпольны бацька», драма, 1996 г., ЗША.
**17.05** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**17.35** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.30** Дакументальная гадзіна: «Нармальнае жыццё», дак. фільм, 2003 г., ЗША.
**19.25** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** «Загадкі Мэрдака», серыял.
**19.20** Вагон.
**20.30** Басанож па свеце.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** «Заказное забойства», маст. фільм, 1984 г., Вялікабрытанія.
**23.05** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Пры афармленні падпіскі будзьце ўважлівымі: з 1 мая змяніліся нашы рэквізіты ў банку. Нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ________

Кассир Всего ________

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА

# ПЕРШАЯ ВІЦЭ-ЛЭДЗІ АЛЬБІЁНУ

Іван БІЧ

**Хаця брытанскія ліберал-дэмакраты — малодшыя партнёр у кааліцыі з кансерватарамі, у нечым яны ўсё ж першыя. Уся Англія закахалася ў Мірыям Гансалес Дзюрантэс — жонку віцэ-прэм'ера.**

Каб зразумець феномен Мірыям, трэба згадаць некалі рэчаў. Перш за ўсё тое, што жонкі намеснікаў прэм'ер-міністраў ніколі не былі персонамі першай лігі брытанскага палітыкуму. Журналісты, якія спрабавалі напісаць кароткую гісторыю гэтага інстытуту, з жахам канстатавалі, што апошні раз імя жонкі віцэ-прэм'ера фігуравала ў прэсе, калі адна з іх пасварылася з сантэхнікам, які няўдала адрамантаваў унітаз у яе доме.

Па-другое, у брытанскім соцыуме існуе як мінімум асцярожнае стаўленне як да Іспаніі, так і да рымскіх каталікоў. Такія забабоны сфармаваліся яшчэ ў часы сярэднявечча, калі Англія была пратэстанцкім бастыёнам у барацьбе супраць экспансіі каталіцкай Іспаніі. Свой уклад у падтрымку фобіі на адрас каталікоў зрабілі ў 1970-я гады і ірландскія тэрарысты (ірландцы ў большасці каталікі). А Мірыям іспанка.

Па-трэцяе, асцярожнае стаўленне да Іспаніі звязана з некаторымі аспектамі дыктатуры Франка. Падчас грамадзянскай вайны ў Іспаніі на баку яго праціўнікаў рэспубліканцаў змагалася шмат брытанцаў левых поглядаў. Вялікая колькасць з іх былі забітыя. Некаторыя трапілі ў канцэнтрацыйныя лагеры і не маглі гадамі выбрацца адтуль. Дарэчы, сама Мірыям нарадзілася каля горадзе Вальядодзід, вядомага сваімі правымі настроямі. У асяроддзі іспанскіх левых Вальядодзід называюць «Фашыстадодзід».

Аднак цяпер усё ў мінулым. За кароткі час Мірыям змагла зруйнаваць старыя стэрэатыпы.

Яна нарадзілася ў 1968 годзе ў сям'і настаўнікаў у гарадку Альмеда. Бацька яе быў мэрам невялікага горада і пазней сенатарам рэгіянальнага парламенту. Мірыям вучылася на юрфаку. Пасля здабыла стыпендыю ў Еўрапейскім каледжы ў Бельгіі, дзе і пазнаёмілася з Нікам Клегам. У 1990 годзе яна атрымала пасаду дарадцы па праблемах Усходу пра камісары Еўрасаюзу. Мірыям з'яўляецца аўтарам кнігі па пытаннях міжнароднага гандлю. Цяпер місіс Клег кіруе адным з дэпартаментаў у юрыдычнай фірме "DLA Piper".





Мірыям Дзюрантэс з мужам Нікам Клегам

Мірыям вельмі актыўна ўдзельнічала ў кампаніі, хаця сама як грамадзянка Іспаніі не мела права галасаваць на выбарах

Па словах Ніка, спачатку ён амаль не разумеў, пра што гаварыць, аднак пачуццё адзіноты, якое панавала ў каледжы, падштурхнула яго падтрымліваць кантакт, які з часам перарос у нешта большае.

Па версіі Мірыям, іскра паміж імі ўспыхнула, калі Нік пагадзіўся танцаваць з ёй фламенка. Усе іншыя пабаяліся.

Яны сустракаліся некалькі год, пакуль у 2000-м не адбылося вяселля. У Клега трое сыноў. Яны ўсе маюць іспанскія імёны — Антонія, Мігуэль і Альберта. Іспанскія імёны дзяцей былі часткай дамовы паміж Нікам і Мірыям. Мірыям пагадзілася, што ўсе дзеці будуць насіць прозвішча «Клег», аднак узамен патрабавала, каб іх называлі іспанскімі імёнамі. Усе хлопцы ходзяць у касцёл. Аднак тут ніякай дамовы не было. Клег не верыць у Бога, і яму ўся роўна, каму моляцца яго малыя. Сябры характарызуюць сямейнае жыццё Клегаў як сталую канкурэнцыю дзвюх роўных асобаў.

Нават выданні, якія сімпатызуюць ліберал-дэмакратам, прызнаюць, што Мірыям не пасуе канонам брытанскага жаночага хараства. У гэтым плане ёй вельмі далёка да Саманты Камерун — жонкі прэм'ера Дэвіда Камеруна. Аднак тым не менш менавіта Мірыям, а не Саманта акупуе вокладкі часопісаў. Яшчэ падчас выбарчай кампаніі па апытаннях у інтэрнэце яе прызналі лепшым кандыдатам на пасаду Першай лэдзі.

У чым сакрэт трыумфу іспанкі? Тут некалькі складовых. Вялікую памылку зрабілі блізкія да торы выданні, якія падчас кампаніі спрабавалі абвінавацiць Клега ў касмапалітызме. Такая ксенафобская кампанія аўтаматычна выклікала адмоўную рэакцыю сярод нацыянальных меншасцяў. Для іх Мірыям — гэта своеасаблівы доказ таго, што ўсе ў Брытаніі роўныя.

Аднак галоўны плюс Мірыям — яе сацыяльны статус. Так атрымалася, што жонкі канкурэнтаў Клега не працавалі. Саманта зараз цяжарная, а Сара Браун была на момант кампаніі хатняй гаспадыняй. Гэта і прыцягнула сімпатыі брытанцаў да Мірыям. Па словах палітолагаў, наяўнасць каля прэм'ера незалежнай актыўнай жанчыны вельмі падабаецца выбаршчыкам.

Гэта не навіна. Варта заўважыць, што рашэнне Сары Браун пакінуць у свой час пасаду менеджэра буйной кампаніі, каб заняцца гаспадаркай у доме мужа-прэм'ера, адразу не спадабалася электарату.

Па-другое, Мірыям вельмі актыўна ўдзельнічала ў кампаніі, хаця сама як грамадзянка Іспаніі не мела права галасаваць на выбарах. Яна штодня давала інтэрв'ю, раздавала пракламацыі мінакам у адным з паўночных раёнаў Лондана, дзе балатаваўся сябра Ніка. Яе здымкі — жанчына з эмацыйным чырвоным ад спрэчак з апанентамі тварам, былі не падобны на здымкі Саманты. Фатаграфічная сесія Саманты — гэта шэраг здымкаў, дзе яна цяжарная і арыстакратычная, уся ў белым, ляжыць у абдымках мужа.

Застаецца згадаць, як каментуюць з'яву Мірыям на яе бацькаўшчыне. Іспанская прэса папросту ў захапленні ад поспеху зямлячкі. Самыя радыкальныя каментатары нават думаюць, што Мірыям зможа вярнуць у склад Іспаніі захоплены брытанцамі яшчэ ў XVII стагоддзі Гібралтар.



Саманта і Дэвід Камерун

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Заява Лукашэнкі (прапанова прадаць «Белтрансгаз» у абмен на нізкія нафтавыя мыты) — сведчанне «беднага становішча» Беларусі. Масква даўно хоча атрымаць кантроль над энергетычнымі галінамі транзітных краін — Беларусі і Украіны. Дагэтуль Лукашэнка ад падобных прапаноў адмаўляўся.

**«Berliner Zeitung» (Германія)**

«Атрымаўся квадрат: Расія–Казахстан–Беларусь–Еўропа. Калі для першых дзвюх актуальнае пытанне: «Хто з намі?», то Мінск ніяк не можа вырашыць — «З кім мы?». Беларусь спрабуе сядзець на двух крэслах. Не адпрэчвае «Усходняе партнёрства», не падпісвае дакументы па Мытным саюзе, і ў той жа час краіна «гатовая да ўвядзення ў дзеянне ў поўным аб'ёме рэжыму адзінай мытнай тэрыторыі Мытнага саюзу». Беларускі бок паводзіць сябе падобна багатай нявесце, мяркуючы, а што могуць прапанаваць ёй патэнцыйныя «жаніхі».

**«РБК daily» (Расія)**

У выпадку з Беларуссю расійскім мытнікам, верагодна, давядзецца нават узмацняць мяжу. 29 мая ўлады Беларусі абвясцілі пра працяг працы па ратыфікацыі Мытнага кодэкса Мытнага саюза. У Мінска пры гэтым застаецца магчымасць абвясціць, што Мытны кодэкс працуе ў Беларусі ў аднабаковым парадку. Пры адсутнасці ў Беларусі мытнага кантролю на мяжы з РФ Расія будзе вымушана цалкам аднавіць мяжу.

**«Волжская камуна» (Расія)**

Натуральна, беларускае кіраўніцтва зацікаўлена ў субсідыях па нафтагазавых каналах, якія атрымлівала ў папярэднія гады, але, думаю, што яно не зможа атрымліваць іх у ранейшых маштабах. Нельга столькі год атрымліваць субсідыі ад Расіі, выдаючы гэта за ўласныя поспехі. Але, хутчэй за ўсё, канчатковае рашэнне пытання будуць адкладаць да таго моманту, пакуль расійскі газ не пойдзе па «Паўночнаму патоку». Пасля гэтага Лукашэнка і пытаць ніхто не будзе.

**«Deutsche Welle» (Германія)**

У расійска-беларускіх адносінах занадта шмат нявырашаных праблем. Акрамя сітуацыі з экспартам нафты і нафтапрадуктаў існуе запазычанасць Мінска па пастаўках газу. Ёсць і праблема абмежаванняў паставак расійскіх тавараў на беларускі рынак. Узніклі сур'ёзныя палітычныя рознагалоссі. Лукашэнка ўжо ў адкрытую заяўляе, што «цэнтры» апазіцыі Мінску знаходзяцца ў Расіі. У такой сітуацыі не зразумела, што (а галоўнае — калі) зменіцца з пачаткам працы Адзінай эканамічнай прасторы. Новая форма інтэграцыі прадугледжвае большае збліжэнне эканомік краін-удзельніц. Як планавая эканоміка Беларусі «ўпішацца» ў аб'яднанне рынкавых гаспадарак сваіх партнёраў, не зразумела. Таму цалкам верагодна знікненне самага фармату «тройкі».

**«Вести» (Казахстан)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### АЗЕРБАЙДЖАН. ПАДРУЧНІК ДЛЯ ЎСІХ ЦЮРКАЎ

Ганіра Пашаева, дэпутат азербайджанскага парламента, прапанавала стварыць адзіны падручнік гісторыі для школьнікаў цюркамоўных краін. «Калі гэта адбудзецца, то ў насельніцтва цюркамоўных дзяржаў (Турцыя, Азербайджан, Казахстан, Узбекістан, Туркменія) адчуванне духоўнага адзінства стане больш моцным, узрасце жаданне да інтэграцыі», — сказала азербайджанскі дэпутат. Спадарыня Пашаева таксама марыць пра стварэнне агульнага тэлевізійнага канала для згаданых краін. Паколькі Пашаева належыць да фракцыі прапрэзідэнцкай партыі, магчыма, што праект прайшоў узгадненне ў Адміністрацыі кіраўніка дзяржавы, і прадмет «Гісторыя цюркамоўных дзяржаў» сапраўды ў хуткім часе з'явіцца, прынамсі, у школьнай праграме азербайджанскіх школ.

**Па матэрыялах «Трэнд» (Азербайджан)**

### УКРАІНА. ВЯНОК ПРАДАДЗЕНЫ



У Кіеве адбыўся незвычайны аўкцыён, адзіным лотам якога быў хваёвы вянок. Гэты быў той самы вянок, які ўпаў на прэзідэнта Януковіча з-за парыву ветру падчас ускладання на магілу невядомага салдата ў Кіеве. Здымкі таго падзення трапілі ў інтэрнэт і выклікалі сапраўдны бум. Уся краіна смяялася з гаранта, а вянок стаў культавым прадметам для «аранжавай» апазіцыі. Узнік нават рух «Шануй хвою», Януковічу далі прозвішча «Ялінкападзінскі». Таму не дзіўна, што продаж таго самага вянку выклікаў вялікую цікавасць. Прадавала яго праварадыкальная групоўка «Братство», якой, як гаворыцца на сайце, «дастаўся» культавы прадмет. Папярэдні кошт складаў 8 тысяч грыўняў (прыкладна 1000 долараў), аднак у выніку таргоў лот быў прададзены за 42 тысячы грыўняў. Набыў яго нехта NikolayPavl, які пажадаў застацца невядомым. Грошы, атрыманыя ад продажу, пойдуць на аплату адвакатаў, якія абараняюць у судзе двух хлопцаў, затрыманых падчас нядаўняга маршу неанацыстаў у Адэсе.

**Па матэрыялах сайта «Братство» (Украіна)**

### ІСПАНІЯ. КРАІНА РЫХТУЕЦЦА ДА КАНЦА СВЕТУ

Група «G. S. E. 2012» з Іспаніі пачала будаўніцтва бункераў, у якіх быццам можна будзе перажыць канец свету. Апакаліпсіс, паводле заяваў арганізатараў праекта, адбудзецца 21 снежня бягучага года. Такі сцэнар быццам абяцае каляндар старадаўняга амерыканскага племені майя. Прыхільнікі тэорыі кажуць, што ініцыятыва з бункерамі выклікала вялікую цікавасць у грамадства. Адзін бункер, які знаходзіцца на глыбіні 1600 метраў, ужо пабудаваны пад Мадрыдам. У ім можа змясціцца 150 чалавек. Прычым будаўнікі бункеру кажуць, што па коштах арыентуюцца на заробкі сярэдняга іспанца. Адно месца каштуе 820 еўра. Ёсць і бізнес-клас, які каштуе прыкладна 2000 еўра. Увогуле, плануецца пабудаваць падобныя сховішча ў кожнай іспанскай правінцыі. Цікава, што будаўнікі дапускаюць варыянт, што апакаліпсісу не будзе. Аднак забраніраванае месца ў бункерах усё роўна спатрэбіцца кліентам, з улікам працэсаў глабальнага пацяплення і пашырэння сеткі заўсёды небяспечных атамных станцый.

**Па матэрыялах «Dziennik» (Польшча)**

### ФРАНЦЫЯ. 70 ГАДОЎ ПАРАЗЫ

Францыя адзначае сумны юбілей. 70 год таму літаральна за тыдзень краіна была захоплена нямецкімі акупантамі. 13 мая немцы перайшлі ў атаку, а ўжо 25-га была падпісана капітуляцыя. Як магла французская армія, адна з найбольш вялікіх армій свайго часу, быць разбітай так хутка? Гісторыкі дасюль спрачаюцца на гэты конт. Раней лічылася, што галоўным фактарам была дэмаралізацыя французскага грамадства напярэдадні вайны. Краіна перажывала палітычны крызіс. Было моцным класавае супрацьстаянне. У войсках квітнеў алкагалізм і адсутнічала дысцыпліна. Цяпер гісторыкі прапануюць новую версію: французскі генеральны штаб адмовіўся прааналізаваць схему нападу немцаў на Польшчу і працягваў верыць у тое, што вайна будзе пазіцыйнай. Для іх ідэя танкавых прарываў здавалася папросту нелагічнай. Між тым, па той бок Ла-Манша з гонарам згадваюць пра май 1940 года. Англічане змаглі тады правесці эвакуацыю свайго корпуса з Дзюнкерку на радзіму. Акрамя таго, англічане рашуча, у адрозненні ад французаў, заявілі пра намер змагацца. 27 мая, выступаючы з прагрмнай прамовай, новы прэм'ер Вялікабрытаніі Уінстан Чэрчыль заявіў, што майскія дні 1940-га будуць і праз тысячу гадоў згадвацца як самыя слаўтыя дні ў гісторыі Брытанскай Імперыі.

**Па матэрыялах еўрапейскай прэсы**

▸ **ВЫБАРЫ**

# УСЯ ЎЛАДА КЛОЎНАМ!

*Алег ПЯТРОЎ*

**Ісландыя працягвае здзіўляць свет. Мала ім дэфолту і вывяржэння вулкану. Цяпер да ўлады ў сталіцы прыйшла партыя пад кіраўніцтвам мясцовага коміка.**




Увогуле, удзел у выбарах партый, праграмы якіх утрымліваюць камічныя лозунгі, не ісландскае ноў-хаў. Можна згадаць яшчэ заснаваную ў пачатку ХХ стагоддзя пражскай багемай Партыю радыкальных рэформаў у рамках існуючага закона. Партыя, нефармальным лідэрам якой быў Яраслаў Гашак і якая абяцала ў выпадку сваёй перамогі выдаць кожнаму пражаніну кішэнны акварыум, на выбарах сабрала 14 галасоў.

У 1979 годзе спрабаваў балатавацца на пасаду прэзідэнта Францыі вядомы комік Калюш, які называў сябе «кандыдат — абсалютны нуль». Пасля таго, як рэйтынг Калюша дасягнуў 16 працэнтаў, палітычны бамонд не на жарт перапалохаўся. Коміку пачалі пагражаць, яго сябра загінуў пры таямнічых абставінах. У выніку Калюш зняў кандыдатуру на карысць Франсуа Мітэрана.

Усе згаданыя камічныя партыі і асобы ўдзельнічалі ў выбарах, набіралі нейкія працэнты, аднак перамагчы комікі ўпершыню здолелі толькі ў Ісландыі.

Здарылася гэта 29 мая. На выбарах у гарадскі парламент Рэйк'явіку 34,7 працэнта галасоў атрымала «Лепшая партыя» — праект мясцовых камедыянтаў. Іх галоўнага канкурэнта, правую Незалежную партыю, падтрымалі 33,6 працэнта выбарцаў, Сацыял-дэмакратычны альянс — 19 працэнтаў, «Зялёныя» набралі 7 працэнтаў. Такім чынам, 6 з 15 месцаў у гарадскім савеце дасталіся «лепшым». Акрамя таго, па мясцовых законах, лідэр партыі, якая атрымала нават адносную большасць у гарадскім савеце, робіцца бургамістрам.

Новым кіраўніком ісландскай сталіцы стане Йон Гнар. Йон Гнар нарадзіўся ў 1967 годзе. У маладосці быў панкам і нават іграў на гітары ў нейкай групе. Пачынаў сваю кар'еру на радыё. Пасля пісаў сцэнары для камедыйных шоу. У 2002 годзе паспрабаваў сябе на сцэне мясцовага камедзі-клаб. Быў рэжысёрам фільму. Акрамя таго, працаваў крэатыўным менеджэрам адной з кампаній.

У лістападзе мінулага года Йону прыйшла думка заснаваць партыю. На старце гэта было падобна да забаўкі. Так, бацькі-заснавальнікі заяўлялі, што іхняя партыя цалкам карумпаваная. У партыі не было праграмы: кіраўніцтва казала, што праграма — гэта сакрэт, які стане вядомы выключна пасля таго, як «лепшыя» прыйдуць да ўлады. Здавалася, што сэнс праекту — папросту пасмяяцца з галоўных тэмаў ісландскай палітыкі.

Аднак на нейкім этапе нечакана людзі пачалі масава запісвацца ў шэрагі «Лепшай партыі». Хутка ўзнікла ідэя паспрабаваць удзельнічаць у выбарах. Першы блін не аказаўся камяком — і вось пасля выбараў 29 мая «лепшыя» ўзялі пад кантроль сталічную мэрыю.

Што далей? Хаос і анархія, цырк і шоу? Не ўсё так проста.

Выбарчая платформа «Лепшай партыі», якая складаецца з 13 пунктаў, утрымлівае патрабаванні, характэрныя для партый левага спектру. Напрыклад, барацьба з карупцыяй, эфектыўная дэмакратыя, адмена платы за праезд для студэнтаў і бедных. Ёсць, натуральна, і жартоўныя абяцанні: «ручнікі ў басейнах для ўсіх», набыццё палярнага мядзведзя для гарадскога заапарку, будаўніцтва Дыснэйлэнду пад Рэйк'явікам і абвяшчэнне тэрыторыі парламента з 2020 года зонай, дзе будзе забаронена ўжываць наркотыкі. Акрамя таго, падчас кампаніі ў буклетах «Лепшай партыі» гаварылася: «Мы абяцаем вам усе, у тым ліку тое, што не будзем выконваць нашых абяцанняў».

Сам Йон Гнар кажа пра сваю будучую палітыку на пасадзе мэра сур'ёзна, без усмешкі. Ён хоча, каб «партыя змяніла сістэму, якая цалкам сябе дыскрэдытавала».

Палітычныя аналітыкі кажуць, што феномен «Лепшай партыі» звязаны з наступствамі эканамічнага крызісу, ахвярамі якога сталі таксама партыі істэблішменту. Прычым крызіс даверу настолькі глыбокі, што не дапамагла нават арганізаванне некаторымі партыямі кампанія, галоўнае пасланне якой — «Стань сур'ёзным, не аддавай горад у рукі клоунаў!». Пра маштаб крызісу таксама сведчаць вынікі апытання, адпаведна якому 70 працэнтаў гараджан пагаджаліся, што папярэдні мэр — сябра Незалежнай партыі, добра рабіў сваю працу.

Пра тое, што наўрад ці Рэйк'явік пасля 29 мая не паратворыцца ў цырк, таксама сведчыць гісторыя іншых партый, якія ўзніклі ў Еўропе падчас крызісу і па выніках выбараў трапілі ў прадстаўнічыя органы. Як правіла, без традыцый партыйнай культуры, з невялікім вопытам кіравання, пабудаваныя на харызме лідэра, а не кансалідаваныя ідэйна, яны хутка развальваліся (нідэрландскі Ліст Піма Фартэйна), або блакіраваліся са старымі партыямі (шведская «Партыя піратаў», дэпутацкая група якой у Еўрапарламенце ўступіла ў фракцыю «Зялёных»).

Акрамя таго, як дэманструюць лічбы, «Лепшая партыя» не мае абсалютнай большасці ў радзе Рэйк'явіку. Ёй давядзецца шукаць саюзнікаў, якімі, хутчэй за ўсё, стануць эсдэкі або «Зялёныя». Гэтыя партыі маюць досвед камунальнай палітыкі і, відавочна, не дапусцяць хаосу ў гарадской гаспадарцы.

У гэтым плане трыумф «Лепшай партыі» можна спісаць на праяву псіхалогіі людзей у часы крызісу. У такі час хочацца забыцца пра цяжкасці. Кожны робіць гэта па-рознаму: адны п'юць, іншыя ідуць у казіно. У Еўропе зараз стала папулярным чытаць кнігі. А вось ісландцы галасуюць за комікаў.

МЕРКАВАННЕ

# НЕЗАЛЕЖНАЯ І ФЕДЭРАЛЬНАЯ

**На думку «аранжавай» апазіцыі, Януковіч рыхтуе грамадскую думку да паступовай змены дзяржаўнага ладу. У хуткім часе замест назвы «Украіна» на карце свету можа з'явіцца надпіс «Украінская Федэральная Рэспубліка». Наколькі магчымы такі сцэнар? Пра сучасны палітычны працэс ва Украіне журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з кіеўскім палітолагам Уладзімірам Задзіракам.**

***— Наколькі вядома, чуткі пра рэформу дзяржаўнага ладу пайшлі пасля заявы прэм'ер-міністра Віктара Ціханава. Ён распавядаў, што бачыць Украіну як федэрацыю, аднак пад ціскам грамадскай крытыкі пазней сказаў, што яго не так зразумелі. Больш ніякіх афіцыйных заяў пра адміністратыўную рэформу не было. Чаму ж сёння так шмат спекуляцый наконт магчымай федэралізацыі?***

— Часткова гэту тэму распальвае апазіцыя. «Аранжавыя» навязваюць думку пра тое, што федэралізацыя — гэта першы крок да падзелу Украіны. Тэма расколу дзяржавы сапраўды вельмі адмоўна ўспрымаецца ў народзе. Спроба абвяшчэння падчас «аранжавай рэвалюцыі» ў снежні 2004 года Паўднёваўсходняй украінскай аўтаномнай рэспублікі не прынесла палітычных дывідэндаў аўтарам ідэі — Партыі рэгіёнаў. Апазіцыя хацела б і далей стрыгчы купоны, абвінавачваючы Партыю рэгіёнаў у сепаратызме. З іншага боку, нельга выключаць наяўнасці ў Партыі рэгіёнаў праекту федэралізацыі. Часопіс «Український Тиждень» апублікаваў каментарый аднаго з дэпутатаў ад Партыі рэгіёнаў, які даў зразумець, што ў адміністрацыі Януковіча вядзецца палеміка на гэты конт. Праўда, канкрэтных праектаў яшчэ не стварылі. У любым выпадку, грамадская дыскусія вакол федэралізацыі сапраўды пачалася. У прэсе можна сустрэць прыхільнікаў падобнай ідэі і яе крытыкаў.

***— Якія аргументы ў тых, хто выступае за федэратыўны праект?***

— Яны не трактуюць федэрацыю як стварэнне на ўсходзе краіны рускамоўных аўтаномій, якія ў выпадку чаго могуць збегчы пад руку Масквы. Гаворыцца пра неабходнасць развіцця фінансавай аўтаноміі рэгіёнаў, калі большая частка падаткаў будзе заставацца на месцах. Пры цяперашняй схеме ўсе падаткі ідуць у цэнтр, адкуль рэгіён атрымлівае дадацыі і субсідыі. Звычайна гэта не больш 20 працэнтаў ад таго, што пайшло ў Кіеў. Адным словам, неабходнасць рэформы тлумачаць праз эканоміку. Фігуруюць цікавыя лічбы: быццам федэратыўныя дзяржавы выпрацоўваюць... 

***— Ці існуе ўкраінская школа федэратыўнай думкі?***

— Безумоўна. І тут ёсць вельмі цікавая дэталь. Раней, выступаючы за аўтаномію Усходу, данецкія спасылаліся на прыклад створанай у 1917 годзе бальшавікамі Данецка-Крыварожскай Савецкай Рэспублікі. Яна разглядалася як альтэрнатыва Цэнтральнай Радзе. Цяпер пра савецкія эксперыменты намагаюцца не ўзгадваць. Больш таго, мадэль цяперашняй унітарнасці выводзяць з адміністратыўнай палітыкі СССР. Заклікаючы да федэралізацыі, увесь час узгадваюць выраз заснавальніка Украінскай Народнай Рэспублікі (УНР) Міхаіла Грушэўскага: «Хоць нейкая спроба навязаць мясцовым грамадам механічную унітарнасць, прымусовыя саюзы, будзе памылкай, якая прывядзе выключна да супраціву і створыць глебу для новых канфліктаў». Грушэўскі, Драгаманаў, Ліпіньскі і іншыя заснавальнікі ўкраінскага палітычнага руху былі перакананымі федэралістам. Акрамя таго, у 1919 годзе быў падпісаны так званы «Акт Злукі паміж Заходняй Украінскай Рэспублікай (ЗУР) і Украінскай Народнай Рэспублікай. ЗУР уваходзіла ў склад УНР, аднак пры гэтым пакідаў сабе значную аўтаномію.

***— Што кажуць на гэта іх апаненты?***

— Кажуць, што разуменне ідэі федэрацыі на пачатку XX стагоддзя было абсалютна іншым, чым зараз. Так, — згодныя яны, — правы абласцей трэба пашыраць, аднак ідэя пашырэння паўнамоцтваў рэгіёнаў не патрабуе федэралізацыі. Дастаткова прыняць закон пра пашырэнне мясцовага самакіравання. Небяспека, па іх словах, у тым, што працэс надання рэгіёнам такой жа аўтаноміі, якую, напрыклад, маюць землі ў ФРГ, значыць наданне ім знакаў дзяржаўнасці (гербаў, сцягоў, парламентаў, асобнай сістэмы адукацыі). Фактычна быццам гэта зялёнае святло для пачатку сепарацыі. Рашуча адмятаецца тэзіс пра тое, што культурная сітуацыя на Захадзе і на Усходзе занадта розная. Гэта самы слабы ланцужок у іх схеме доказаў. На днях Львоўскі абласны савет пастанавіў не святкаваць у горадзе 9 мая — Дзень Перамогі. Каментарыяў, думаю, не патрэбна.

***— Ці праводзяцца сацыялагічныя апытанні на гэту тэматыку?***

— Той жа «Український Тиждень» апублікаваў дадзеныя апытання, якія былі зробленыя ў лютым. За ідэю федэралізацыі выступаюць 35 працэнтаў. Яшчэ 35 — за тое, каб адбыўся рэферэндум па гэтаму пытанню. Толькі 16 працэнтаў катэгарычна супраць рэформы. Аднак трэба адзначыць, што зандаж быў зроблены ў лютым, калі Януковіч толькі-толькі прыйшоў да ўлады. Патрэбныя новыя апытанні, каб рабіць высновы наконт стаўлення да ідэі УФР.

***— Чым можа скончыцца цяперашняя палеміка вакол федэралізацыі?***

— Парадокс у тым, што на гэты момант ніякая федэралізацыя Януковічу не патрэбная. Ён заўзята будуе прэзідэнцкую вертыкаль, і перадаваць паўнамоцтвы мясцовым князькам яўна не ў яго інтарэсах. Па-другое, каб Украіна стала федэрацыяй, патрэбна федэратыўная дамова, якую павінны падпісаць усе суб'екты. Як арганізаваць такога кшталту працэс? Па якому прынцыпу дзяліць Украіну на новыя адміністратыўныя адзінкі? Межы гістарычных тэрыторый не адпавядаюць межам сучасных абласцей. Сыходзячы з гістарычнай логікі, некаторыя вобласці трэба аб'ядноўваць. Напрыклад, Таўрыя ўключала ў сябе сучасныя Мікалаеўскую і Херсонскую вобласці. Адэскую і Кіраваградскую вобласці ўвогуле называлі Наваросія. Тут сам чорт нагу зломіць. Не забывайце пра праблему крымскіх татараў, што абавязкова паспрабуюць узняць пытанне аднаўлення нацыянальнай аўтаноміі, якую мелі да 1944 года. Палітычная дэстабілізацыя папросту гарантаваная. Да федэралізацыі справа наўрад ці дойдзе. Аднак Януковічу патрэбна кансалідаваць электарат Усходняй Украіны, дзе ідэя Данецкай Рэспублікі вельмі папулярная. Таму ўрадавыя чыноўнікі, думаецца, працягнуць час ад часу мусіраваць гэтую праблему на радасць як свайму электарату, так і апазіцыі. Апошняя, на радасць ужо свайму электарату, можа бясконца крытыкаваць Януковіча за замах на адзінства дзяржавы.

> Па якому прынцыпу дзяліць Украіну на новыя адміністратыўныя адзінкі? Межы гістарычных тэрыторый не адпавядаюць межам сучасных абласцей. Сыходзячы з гістарычнай логікі, некаторыя вобласці трэба аб'ядноўваць

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ГУРБАНГУЛЫ БЕРДЫМУХАМЕДАЎ

У эпоху папярэдніка-Туркменбашы абавязковай да вывучэння ў школах і ВНУ была кніга «Рухнама», напісаная асабіста Ніязавым. Пасля змены рэжыму «Рухнаму» з бібліятэк выдалілі. А на мінулым тыдні школьнікаў і студэнтаў абавязалі вывучаць новай твор — «Унук, які рэалізаваў мару дзеда». У кнігу ўвайшлі 22 артыкулы нейкага Тачмамеда Джурдзекава, напісаныя ім з кастрычніка 2007 па лістапад 2009 года. Усе артыкулы — пра светлага сына туркменскага народа, лідэра туркменскага Адраджэння, вялікага чалавека, які нясе адказнасць за лёс свайго народа, — пра прэзідэнта Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедава. Парадокс у тым, што Тачмамед Джурдзекаў — былы апаратчык туркменскай Кампартыі. Акрамя таго, пра Ніязава — першага прэзідэнта Туркменіі, якога Гурбангулы змяніў толькі год таму, не сказана ні словы. Застаецца дадаць, што кніга выйшла на трох мовах: туркменскай, рускай і англійскай. Кажуць, хтосьці бачыў асобнікі на нямецкай і кітайскай.



### СЕГАЛЕН РУАЯЛЬ

Былая кандыдатка на пасаду прэзідэнта Францыі ад партыі сацыялістаў нечакана для ўсіх адмовілася ад ідэі выстаўляць сваю кандыдатуру на наступных прэзідэнцкіх выбарах. «Я аддаю перавагу таму, каб ахвяраваць сваімі прэзідэнцкімі амбіцыямі ў імя перамогі левых», — сказала палітык. Заява стала сенсацыяй. Менавіта асабістыя амбіцыі Руаяль даўно падрывалі адзінства партыйных шэрагаў. Як толькі Сегален Руаяль прайграла Нікаля Сарказі ў маі 2007 года, яна заявіла, што гатовая да рэваншу на наступных выбарах у 2012-м. Пасля Руаяль і яе прыхільнікі аспрэчылі вынікі выбараў старшыні партыі, якія Сегален прайграла цяперашняму лідэру сацыялістаў Марцін Абры. Больш таго, яна нават не выключала, што будзе балатавацца як незалежны кандыдат, што пагражала нават існаванню Сацпартыі. І вось цяпер Сегален нечакана выходзіць з гульні. Між тым, у партыі пачынаецца падрыхтоўка да праймерыз, на якіх будзе вызначана імя кандыдата. Пакуль цяжка сказаць, хто стане кандыдатам ад сацыялістаў, аднак шансы ў яго будуць вельмі добрыя. Пасля таго, як Сарказі абвясціў пра намер павялічыць тэрмін выхаду на пенсію, яго рэйтынг моцна ўпаў.



### ІВАН ГАШАПРАВІЧ

Прэзідэнт Славакіі падпісаў спецыяльны ўказ, які забараняе грамадзянам краіны атрымліваць грамадзянства іншых краін. Усім зразумела, што размова ідзе выключна пра права набываць венгерскае грамадзянства. Адпаведна рашэнню, якое нядаўна прынялі ў Будапешце, усё этнічныя венгры, які жывуць за мяжой краіны, могуць атрымаць венгерскія пашпарты. Нагадаем, што па выніках першай сусветнай вайны Венгрыя, якая ўваходзіла ў склад дзяржавы Габсбургаў, страціла амаль палову сваіх зямель. Тая падзея стала нацыянальным болем. Раней была прынятая праграма падтрымкі дыяспары, пазней — уведзеная «карты венгра». Цяпер вось аўтаматычна вярнулі ўсіх сваякоў у венгерскае грамадзянства. Найбольш небяспечная рэалізацыя ўказу для Славакіі, дзе жывуць каля паўмільёна венграў. Таму Гашпаравічам і быў прыняты ўказ пра забарону падвоенага грамадзянства. Аргументуючы неабходнасць сіметрычнага адказу, Браціслава абвінавапіла венгерскі ўрад у жаданні аднавіць межы на момант пачатку першай сусветнай вайны. Цікава, што іншыя краіны, якія ўзніклі на рэштках Аўстра-Венгрыі, ініцыятыву Будапешта праігнаравалі. Між тым, у славацкім парламенце ёсць дэпутацкая група ад партыі венграў. Іх ужо папярэдзілі, што ў выпадку прыняцця венгерскага грамадзянства ў іх адбяруць дэпутацкія мандаты.

КАРНАВАЛ

# ЧУЙНЫ СОН ВЯЛІКАГА ГОРАДА

Алесь ГІНЗБУРГ

**«Абудзі гэты горад, ён спіць!» — пад такім лозунгам 30 мая ў Мінску (а дакладней, па Мінску) прайшоў лятучы карнавал вулічнага мастацтва. Паэты, музыкі і майстры агнявога шоу выйшлі на вуліцы сталіцы, каб давесці, што там ёсць месца творчасці.**




## «Я баяўся арышту»

«Сучаснае мастацтва загнанае ў катакомбы галерэй, музеі, душныя актавыя залі. Гэта няправільна! Наша мэта — вывесці культуру з рэзервацыі ў публічную прастору» — пачаў сваю прамову Кірыла Ільніцкі, удзельнік студыі «Фартынбрас» пры «Свабодным тэатры». Ён працаваў чымсьці накшталт сярэднявечнага глашатая, прыцягваючы ўвагу мінакоў да «прадстаўлення».

Удзел у імправізаваных вулічных чытаннях узялі паэты Андрэй Адамовіч, Марыя Мартысевіч, Вера Бурлак, Віктар Жыбуль, Віталь Рыжкоў, Андрэй Хадановіч. Ім акампаніраваў гурт «re1ikt». Выступ Хадановіча на пляцоўцы каля помніка А. Пушкіна над Свіслаччу быў кульмінацыяй, бо яму тварышавала шоу-група «Палымяны Бармаглот». Так што імпрэза зацягнулася да дзесятай вечара — прыкладна ў гэты час у маі над Беларуссю заходзіць сонца.

Іншыя чытанні праходзілі каля Мінскай ратушы, на скрыжаванні Нямігі і праспекта Пераможцаў, каля кінатэатра «Масква», — то бок, у месцах, дзе нядзельным вечарам шмат адпачывальнікаў са спальных раёнаў горада. Некаторых з такіх выпадковых гледачоў, як ні скептычна былі настроены ўдзельнікі да такога варыянту развіцця падзей, нават удалося зацягнуць у шэрагі аматараў паэзіі. А вось разгонаў і арыштаў, якія таксама страшылі многіх патэнцыйных удзельнікаў шоу, наадварот, не адбылося.

Андрэй Адамовіч, чыёй роляй было пачынаць няпростыя вулічныя чытанні ва ўмовах, калі трэба перакрыкваць транспарт і іншыя гукі вуліцы, прызнаецца: «Было прыкольна, але было бачна, што мінакам не надта цікава. Да таго ж, я сур'ёзна баяўся, што мяне арыштуюць». Да канца вечара настроі змяніліся: «Выступ Хадановіча з фаер-шоу быў адной з самых прыгожых творчых акцый, якія я бачыў у Мінску», — дзеліцца ўражаннямі адзін з гледачоў.

## «Бюджэт фестывалю — нуль»

«Нашай мэтай, — кажа Кірыл Ільніцкі, — было зрабіць спробу фестывалю вулічнага мастацтва ў Мінску. Паглядзець, ці актыўна пагаджаюцца да выступу ў такіх умовах творцы, як рэагуе публіка. Пра публіку магу сказаць: яна актыўна далучаецца. Часам на «кропках» спынялася да 120 чалавек, у той час як па тэлефонным запісе мы сабралі 25. Я думаю, за ўвесь час мерапрыемства каля паэтаў спынілася да тысячы чалавек. І тым цікавей, што бюджэт мы мелі — нуль рублёў. Магчыма, такі поспех ад таго, што ніякай канкурэнцыі не было.

Па сведчанні тэатразнаўцы са Штутгарту, аднаго з гледачоў акцыі, у Нямеччыне немагчыма сабраць такую колькасць публікі на вулічны канцэрт, бо на кожным рагу адбываецца нейкая імпрэза. А ў Мінску цікавасць ёсць — няма прапановы. Калі б у горад актыўней выходзілі вулічныя артысты, людзі больш актыўна прыходзілі б у цэнтр. У Мінску пасля канца працоўнага дня пуста, бо няма атракцый: мала кавярняў, мала забаваў. Таму «культурны адпачынак» выліваецца ў п'янае хаджэнне па вуліцах».

Па словах Кірыла, найбольшую стойкасць і вытрымку падчас падрыхтоўкі акцыі праявілі паэты: «Музыкі ды вулічныя фокуснікі і майстры пантамімы адзін за адным адмаўляліся выступаць на вуліцы — а гэта ж іх асноўнае, прыроднае месца працы! А вось паэты наадварот, ахвотна выйшлі ў незвычайнае для сябе асяроддзе. Андрэй Хадановіч нават знайшоў новых прыхільнікаў. Яны б ніколі ў іншых умовах не пазнаёміліся з яго творчасцю — усе інфармацыйныя каналы ідуць проста міма іх!»

Задаволеныя вынікам, менеджэры «Свабоднага тэатру» плануюць шукаць сродкі на вялікі карнавал вулічнага мастацтва ў Мінску ўвосень 2010 года. «Будзе не 5, а 50 кропак, шырокае інфармаванне. Акцыя 30 мая паказала: гэта патрэбна нашаму гораду».

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# БЕЛАРУСЬ — ШВЕЦЫЯ

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі 1 чэрвеня адбылася прэзентацыя беларускага выдання доктарскай дысертацыі шведскага гісторыка беларускага паходжання Андрэя Катлярчука «У цяню Польшчы і Расіі. Вялікае княства Літоўскае і Швецыя ў часе еўрапейскага крызісу сярэдзіны XVII стагоддзя».**

Гэта ілюстраванае 306-старонкавае выданне ўпершыню выходзіць асобнай кнігай на беларускай мове. Раней яно друкавалася на старонках часопіса «Arche» ў 2008 годзе.

У даследаванні адлюстроўваюцца спробы ВКЛ заключыць Кейданскую дамову 17–20 жніўня 1655 года аб дзяржаўнай уніі са Швецыяй. Асобныя часткі манаграфіі прысвечаныя ўкраінска-шведскім і ўкраінска-расійскім дачыненням. Кніга выдадзена пры падтрымцы Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» і пасольства Швецыі ў Беларусі.

Паводле слоў пасла Швецыі Стэфана Эрыксана, выданне часткова дае адказ на пытанне аб прычынах актывізацыі сучасных шведска-беларускіх кантактаў. Вельмі блізкія адносіны дзвюх краін 300 гадоў таму жывяць сённяшнія сувязі, — сказаў дыпламат.

Як адзначыў Катлярчук, няўдалая Кейданская унія з'яўляецца спробай ВКЛ выбраць трэці — паўночны шлях паміж Польшчай і Расіяй. На думку гісторыка, падпісанне Кейданскай дамовы з Швецыяй, якая ў сярэдзіне XVII стагоддзя была імперыяй і мяжавала з ВКЛ, стала «інфармацыйнай бомбай» для жыхароў княства, бо рушыла ўвесь 300-гадовы ўклад жыцця. Даследчык падкрэсліў, што пасля раптоўнай смерці 31 снежня 1655 года ініцыятара уніі, вялікага гетмана ВКЛ Януша Радзівіла (існуе версія, што ён быў атручаны) і антышведскага паўстання ў Жамойціі дамова страціла сілу. Паводле яго слоў, пасля уніі пачалася паланізацыя шляхты, дыскрымінацыя пратэстантызму і праваслаўя.

Гісторык мяркуе, што выданне дапамагае супрацоўніцтву Беларусі са Швецыяй, якая пасля працяглага перапынку вяртаецца да паўднёвага напрамку сваёй знешняй палітыкі.

Прэзентацыі кнігі прайшлі 2 чэрвеня ў Віцебску, 3 чэрвеня ў Магілёве і Гомелі, 4 чэрвеня — у Баранавічах.

**Марат Гаравы, БелаПАН**

ЧЫТАННІ

# РАДЗІВІЛЫ — У ЖОДЗІНЕ

Уладзімір СІЎЧЫКАЎ

**У горадзе, знаным найперш як прамысловы, адбыўся другі этап першых Радзівілаўскіх чытанняў «Роля і значэнне роду Радзівілаў у гісторыі Беларусі», якія былі прысвечаны 390-м угодкам дзяржаўнага і ваеннага дзеяча Вялікага княства Літоўскага, мецэната Багуслава Радзівіла.**




Фота аўтара

У вялікай зале Палаца аўтамабілебудаўнікоў перад вучнямі і настаўнікамі, перад дыпламатамі і гасцямі са сталіцы, а таксама са Слуцка, з Нясвіжа, Смалявічаў, Барысава, Караляўца (Калінінграда) выступілі гісторыкі Наста Скеп'ян, Аляксандр Доўнар, Аляксей Шаланда, Наста Жарская, пісьменнік і літаратуразнаўца Пятро Васючэнка, музыказнавец Аляксей Фралоў, журналіст Глеб Лабадзенка і іншыя.

Скульптар Алесь Бацьвінёнак паказаў праект помніка для Жодзіна — бюст Багуслава Радзівіла, а літаратар і выдавец, аўтар гэтых радкоў, прэзентаваў публіцы і перадаў у падарункавы фонд і гарадскім бібліятэкам новае выданне — кнігу «Багуслаў Радзівіл. Аўтабіяграфія».

З асаблівай зацікаўленасцю былі сустрэты архітэктурныя распрацоўкі, паведамленні і відэапраекты жодзінскіх школьнікаў і гімназістаў Насты Мартысюк, Лізаветы Салохінай, Ксеніі Калеснікавай, Насты Красоўскай, Антона Гары, Паліны Сіваковай, Любы Сіліч, Лізаветы Тарасевіч і Юліі Машковіч.

Парадавалі слухачоў сваімі выступамі ансамбль «Эстэціс» Жодзінскай гімназіі №1, трыо «Вытокі» з Дзяржаўнай філармоніі ды гурт «Тутэйшая шляхта» з Белдзяржуніверсітэта.

Сур'ёзную, урачыстую і цікавую імпрэзу правяла Ірына Супрановіч, а прайшла яна пад патранатам жодзінскіх аддзелаў культуры і адукацыі, а таксама жодзінскага краязнаўчага музея. Мяркуецца, што гэтыя чытанні стануць традыцыйнымі, паспрыяюць выхаванню любові да роднай зямлі, пашаны да яе багатай гісторыі і культуры.

СПАДЧЫНА

# Адам Шэмеш: МАСТАК І ЛІТАРАТАР

Аляксей ХАДЫКА

**Якім быў Мінск сярэдзіны XIX стагоддзя? Нарыс «Мінск» аўтарства знакамітага паэта Уладзіслава Сыракомлі, надрукаваны ў часопісе «Teka Wilenska» (№1–2 за 1857 год), дае адказ на гэта і яшчэ шмат якія пытанні.**



Адам Шэмеш. Партрэт Сыракомлі. 1850-я

Горад меў 23 952 жыхары, шляхты — 584, чыноўніцтва — 178, вайскоўцаў — 1 681, духавенства праваслаўнага — 20, каталіцкага — 52. Паводле веравызнання дамінавалі іудзеі — 13 873, затым каталікі — 7 411 і праваслаўныя — 3 547, было каля 300 магаметан і 38 пратэстантаў… Ні памеры, ні суадносіны сацыяльных і канфесіянальных груп ніяк не нагадвалі сучасны Мінск XXI стагоддзя. Як і інтэнсіўнасць мастацкага і культурнага жыцця, якая была не надта напружанай. Сёння адукаваны мінчук сярод мастакоў горада таго часу прыгадае Валенція Ваньковіча — у цэнтры горада стаіць яго музей, і Яна Дамеля. Між тым вядомасць апошніх — у значнай ступені заслуга Адама Шэмеша (1808–1864), які пакінуў некалькі нарысаў пра сучаснікаў. І выступіў суаўтарам Сыракомлі ў нарысе «Мінск». Сам жа застаўся амаль невядомы.

## Рысы біяграфіі

Адам нарадзіўся ў заможнай шляхецкай сям'і маршалка Ігуменскага павета Казіміра Шэмеша і Евы Вендорф, якія валодалі маёнткам Барацічы каля Ігумена (сёння — Чэрвень). «У вялікім, нязграбным старым доме з высокім дахам, са сценамі, счарнелымі ад часу, які, аднак, з-за гасціннасці гаспадароў быў заўсёды прыемны і вясёлы», — так піша ва ўспамінах Ева Фелінская, будучая цешча мастака. Клопатам бацькоў Адам трапіў у Віленскі універсітэт, дзе ў сярэдзіне 1820-х атрымаў ступень магістра філасофіі. Але захапленне мастацтвам прывяло яго на мастацкі факультэт да прафесара жывапісу акурат перад самым закрыццём універсітэта. Віленскі перыяд жыцця Шэмеша складаўся шчасліва.

Мінскі кнігагандляр і біёграф Манюшкі Аляксандр Валіцкі ў нарысе «Крышталевіч», прысвечаным віленскаму дзіваку-бадзягу і паэту, у якім адным з герояў з'яўляецца сябар Крышталевіча Шэмеш, піша: «У той час Шэмеш быў яшчэ багаты, і сэрца, як і кішэню, трымаў для сяброў расчыненымі». Сяброўскія вечарыны, спаборніцтвы ў пісанні вершаў — усё як у звычайнай студэнцкай моладзі.

Жыццё ў Мінску, дзе, вандруючы паміж бацькоўскай сядзібай і горадам, Шэмеш правёў два перыяды — 1831–1842 і 1846–1852, склалася не настолькі шчаслівым. Прафесійна працаваць у Мінскай гімназіі, выкладаючы малюнак, альбо зарабляць выкананнем дэкарацый для тэатра ў першыя мінскія гады Шэмешу не выпала. Ён задавальняўся нязначнымі заробкамі на чыноўнай пасадзе і эпізадычнымі замовамі: выкананне партрэтаў мінскага бамонду, маляванне рэлігійных кампазіцый.

У 1842–1846 гадах быў змушаны выезд у Харкаў, а далей, па дазволе з Пецярбургу — у Саратаў, дзе ў ссылцы знаходзілася цешча мастака Ева Фелінская. Фелінская была пакараная за ўдзел у адным з гурткоў, арганізаваных Шыманам Канарскім для падрыхтоўкі чарговага антыцарскага паўстання. Шэмеш — высланы як недабранадзейны грамадзянін. У Саратаве ён працаваў як партрэтыст, пісаў гістарычныя кампазіцыі, для мясцовага касцёла — вобраз Хрыста ў цярновым вянку. Твар Хрыста ён намаляваў са сваёй цяжарнай жонкі — і цярновы вянок зрабіўся нядобрым знакам. Нарадзіўшы Адаму першынца, Паўліна Фелінская, яго 22-гадовая жонка, памерла.

## Празаічны Мінск

Шэмеш «лёгка валодаў пяром, прыносячы мастацтву большую карысць як крытык» (так піша Вінцэнт Смакоўскі ў нарысе пра Ваньковіча, надрукаваным у 1845 годзе). Ужо ў першы мінскі перыяд, а затым у Херсоне і Саратаве, Шэмеш зрабіў першыя крокі ў стварэнні летапісу сучаснага мастацкага жыцця.

У 1830-я Шэмеш пазнаёміўся з Янам Дамелем, мастаком, упершыню ацэненым менавіта ў біяграфічным эсэ Адама (публікацыя ў віленскім часопісе «Athenaeum» у 1842). І тут Шэмеш раптам шчыра выказваецца пра цяжкую атмасферу тыповага губернскага горада Расіі, у які ператвараўся Мінск. Гэтага няма ў старонках, прысвечаных апісанню мінскіх старажытнасцяў, храмаў, помнікаў у сумесным з Сыракомлем нарысе. Але ў эсэ пра Дамеля, пішучы пра ўмовы працы мастака ў родным горадзе, Шэмеш вельмі крытычны. «Якая сіла волі, якая закаханасць у мастацтва патрабаваліся, каб застацца верным сваёй справе, працягнуць самаўдасканальвацца ў такім антыэстэтычным, празаічным месцы, якім з-за абыякавасці жыхароў да любой працы душы, да якой бы то ні было прыгажосці, з-за недахопу неабходнай мастаку дапамогі (анатамічныя фігуры, антычныя злепкі, добрыя карціны) — з'яўляецца Мінск».

Адзін даследчык культуры былой Рэчы Паспалітай у XIX стагоддзя заўважыў: калі раней мастакі «знаходзіліся на службе караля або магнатаў і былі іх «пенсіянерамі», цяпер яны зрабіліся прадстаўнікамі вольных прафесій ці займалі пасады дзяржаўных службоўцаў».



Фрыдрых Авербек. Марыя і Лізавета. 1825. Гэта ўзор жывапісу «назарэйскай» школы, ідэал прапагандаванай Шэмешам рэлігійнасці ў мастацтве

Поспех залежаў ад інтэнсіўнасці мастацкага жыцця, а ў 25-тысячным Мінску яго падтрымлівалі толькі асобныя аматары-калекцыянеры. Такія, як губернскі сакратар Юры Кабылінскі, стваральнік вялікага прыватнага музея: ён дапамог Дамелю прыдбаць дом і майстэрню ў Мінску. Але такіх былі адзінкі.

## План ратавання мастацтва

Пра якія спосабы пераадолення апатыі на мастацкім рынку выказваўся Шэмеш? Паводле слоў літаратурнага крытыка Міхала Грабоўскага, мастак меў ідэю ўласнага праекта. Ён марыў «адкрыць пастаянную выставу карцін пад апекаю аднаго альбо некалькіх аматараў мастацтва… дзе кожны мог бы бясплатна, альбо за нявялікі кошт бачыць работы мастакоў нашага краю… і каб пра гэтыя выставы з'яўляліся справаздачы ў «Атэнэуме».

Злабадзённы план, калі ўлічыць, што Віленскі універсітэт — адзіны, дзе з 1818 года ладзіліся выставы ў краі, — быў зачынены, а сучасныя дзеячы культуры, Ю. Крашэўскі, А. Кіркор, В. Смакоўскі з артыкуламі пра мастацкія выступалі эпізадычна. Насуперак перасцярогам аб «празаічнасці» Мінска, горадам, дзе можна рабіць экспазіцыі сучаснага мастацтва, Шэмеш называе менавіта яго, «паколькі тут збіраецца даволі значнае грамадства». Захапленне гісторыяй роднага горада, знаёмства з яго лепшымі людзьмі, неабыякавае стаўленне да яго, прывязвалі мастака да Мінска.

У палеміцы на старонках польскамоўных часопісаў у 1844–1845 гадах, у якой бралі ўдзел Шэмеш, Крашэўскі, Грабоўскі, Смакоўскі, не было адзінства наконт месца і сацыяльнага асяроддзя, якія б прапанавалі спрыяльныя для ўздыму мастацтва ўмовы. Грабоўскі сцвярджаў, што «ніводзін горад у нас не мае ўмоў зрабіцца калыскай нацыянальнага мастацтва, хутчэй наадварот, правінцыя, пастаянны прытулак больш культурнага і заможнага класа, можа даць мастакам больш матэрыяльных пераваг».

Шэмеш пагаджаўся з гэтым са скрухай, адзначаючы недахоп праяў мастацкіх патрэбаў: «Нецікавая, шэрая новая архітэктура гарадоў і вёсак, паркавае мастацтва, што занепадае, абыякавасць да знешняй формы і… апатыя таго пачуцця, якое магло б прадказаць і падтрымліваць пластычнае мастацтва…»

Фактычна ўдзельнікі дыскусіі 1840-х гадоў заклікалі да падтрымкі творцаў, якія цярпелі ад недастатковага разумення.

## Рамантык і рэаліст

Якую праграму развіцця нацыянальнага мастацтва ўяўляў сабе Шэмеш? Яна вынікала з яго творчага крэда. Графік Антоні Залескі ў надрукаваным у 1864 годзе некралозе назваў Шэмеша «літоўскім Авербекам». Паказальнае параўнанне з адным з вядучых жывапісцаў «назарэйскай» школы ў Рыме немцам Фрыдрыхам Авербекам, які вяртаў у еўрапейскае мастацтва першай паловы XIX стагоддзя рэлігійны дух, наследуючы ўзоры жывапісу ранняга італьянскага Рэнесансу.

Ва ўспамінах пра віленскую школу, дасланых у «Атэнэум» (1844) з саратаўскай ссылкі, Шэмеш выказвае падобную пазіцыю і крытыкуе сваіх сучаснікаў-мастакоў за страту «чыстасардэчнай рэлігійнасці», празаізм творчасці. Тэасофская пазіцыя збліжае Шэмеша з крытыкам Міхалам Грабоўскім (1804–1863). Падобна як Шэмеш, той бачыў у рэлігійным аспекце творчасці залог маральна-этычнага і прафесійнага прагрэсу. Шэмеша і Грабоўскага яднала перакананне, што адраджэнню вялікага мастацтва ў краі павінна служыць абуджэнне інтарэсу мастакоў і літаратараў да гістарычнай спадчыны народа, да выдатных, павучальных сюжэтаў мінуўшчыны. Невыпадкова Грабоўскі як літаратурны крытык быў першаадкрывальнікам раманаў Вальтэра Скота для польскамоўнага чытача.

Імкнучыся падтрымаць цікаўнасць Шэмеша да нацыянальнай гісторыі, напачатку 1840-х Грабоўскі знайшоў для яго замову на 2 карціны з сюжэтамі часоў Яна III Сабескага. Шэмеш у эсэ пра віленскую школу ясна фармулюе праграму будучага росквіту нацыянальнага мастацтва. У нас ёсць, піша ён, «прыгожыя азёры, зялёныя даліны, вялікія лясы, чароўныя месцы і над Нёманам, і ў Інфлянтах, і ля Трокаў, і ў Падоліі; вясковы люд з жывапіснымі і разнастайнымі народнымі ўборамі; ёсць гісторыя, поўная ўзвышаных і на дзіва прыгожых эпізодаў, здольных захапіць мастака… Ёсць і каталіцкая вера, якая дапамагла ўздыму мастацтва ў Італіі, сярэднявечнай і сучаснай Германіі».

Рамантычная ідэалізацыя народнага духу і гістарычнага мінулага, дапоўненая надзеямі на рэлігійнае адраджэнне, ставіць Шэмеша поруч з Янам Чачотам, Адамам Міцкевічам і асабліва Юзафам Крашэўскім. З апошнім, які кіраваў «Атэнэумам» у 1841–1851 гадах, у Шэмеша склаліся сяброўскія адносіны. Тады і з'явіліся ў друку эсэ пра Дамеля і віленскую школу. Глыбока захапляўся Шэмеш паэзіяй Міцкевіча, выканаўшы незахаваныя да сёння палотны «Смерць Робака», сцэну з «Пана Тадэвуша» і жывапісныя ілюстрацыі да «Конрада Валенрода».

Хаця Шэмеш-тэарэтык — відавочны рамантык, пішучы пра Дамеля і іншых сучаснікаў, — ён выглядае свядомым прыхільнікам рэалістычнага стылю. У штудыях да «Адступлення французаў праз Вільню» Дамеля, Шэмеш зачараваўся дакладным малюнкам.

Па вяртанні ў Мінск, у другі мінскі перыяд (1846–1852) літаратурна-эсэістычны талент Шэмеша раскрыўся не толькі ў супрацоўніцтве з Сыракомлем над нарысам «Мінск». Яшчэ была супраца з Дуніным-Марцінкевічам і Манюшкам, дэкарацыі для першай пастаноўкі «Сялянкі» («Ідыліі») у 1852 годзе. Недарма ў «імправізацыі» Сыракомлі «У коле знаёмых у Мінску» наш герой прыгаданы як «адзін з самых высакародных людзей». Дэкарацыі спектакля не захаваліся, але збярогся тагачасны, поўны ўзнёсласці, вобраз Сыракомлі, адлюстраваны Шэмешам.

Шэмеш выявіў сябе як таленавіты мастак, але болей — як грунтоўны крытык мастацтва, які бачыў неабходнасць развіцця нацыянальнай школы на глебе звароту да нацыянальных каранёў. І прафесійнай мастацкай адукацыі і працы, разам з арганізацыяй мастацкага жыцця. Мастацкія выставы, пра якія ён марыў, прыйшлі ў Мінск толькі ў 1890-я гады.

▸ АНОНС

# ПЯЦЬ ПРЫЧЫНАЎ, КАБ «BE2GETHER»

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**25–27 чэрвеня на беларуска-літоўскім памежжы адбудзецца музычны фестываль «Be2gether». Падзея збірае тысячы людзей, каб яны маглі здарова прабавіч час разам, незалежна на нацыянальнасць, узрост ці рэлігійныя перакананні. Слоган фэсту - «музыка адчыняе межы». І ў кожнага з вас, на нашу думку, ёсць сама меней 5 прычынаў, каб да гэтага свята далучыцца.**



Skunk Anansie

## Першая — празрыстыя межы

Гэта, відаць, адзіны ў сучаснасці выпадак, калі дзяржаўная мяжа настолькі не перашкода для грамадзяніна Беларусі, які сабраўся на фестываль у іншую краіну. Пры наяўнасці квітка на фестываль «Be2gether» візу ў амбасадзе Літвы вам выдадуць бясплатна. Тэрмін падачы дакументаў працягнуты **да 17 чэрвеня**!

## Другая — рамантычны замак

Выходныя ў ваколіцах замка — добрая традыцыя. Пагатоў — такога шыкоўнага рэнесанснага замка, як у Нарвілішках. Вядомы яшчэ з XVI стагоддзя, у стагоддзі XVIII ён быў адбудаваны манахамі-францішканцамі і дзейнічаў як кляштар. Пасля Лістападаўскага паўстання кляштар быў ліквідаваны ўладамі Расійскай імперыі. Замак быў ператвораны ў баракі, а касцёл пры ім разбураны.

Дзякуючы шчыраванням прадпрымальніка Гедрыуса Клімкявічуса і падтрымцы Еўрасаюзу, у XXI стагоддзі замак быў адрэстаўраваны і атрымаў новае жыццё. Цяпер там гатэль, канферэнцзала, рэстарацыя, а 25–27 чэрвеня тут традыцыйна размесціцца штаб фестывалю.

Каля замка — маляўнічы драўляны касцёл 1929 года ў закапанскім стылі. Касцельны цвінтар месціцца ўжо на тэрыторыі Беларусі.

## Трэцяя — добрая музыка

Сёлета наведнікаў чакае 3 поўныя дні, насычаныя альтэрнатыўнай музыкай розных напрамкаў. На «Be2gether» можна будзе пабачыць больш за 50 выканаўцаў з розных краін свету, у тым ліку «Skunk Anansie» (Вялікабрытанія), «Empire Of The Sun» (Аўстралія), «Roots Manuva» (Вялікабрытанія), «WhoMadeWho» (Данія), «Killa Kela» (Вялікабрытанія), «Гайдамакі» (Украіна), «Casiokids» (Нарвегія), «Bauchklang» (Аўстрыя), «Рубль» (Расія), «Crystal Fighters» (Іспанія), Аліну Арлову (Літва) і шмат іншых. Беларусь на фестывалі прадставяць «CherryVata», «Open Space» і «Akute». Беларускі хэдлайнер — Лявон Вольскі з праектам «Белая яблыня грому».

## Чацвёртая — шмат сяброў

На любой імпрэзе весялей у кампаніі. Групам ад 4-х чалавек на «Be2gether» — 25-працэнтная зніжка на квіткі. Таксама студэнтаў заахвочваць адзначыць паездкай на фестываль здачу летняй сесіі: кошт квітка пры прад'яўленні студбілета — усяго 200 тысяч.

Апроч таго, фэст абяцае быць міжнародным не толькі па складзе выступоўцаў, але і па складзе гледачоў. Ужо 4 гады запар у Нарвілішках беларусы традыцыйна пабратаюцца з літоўцамі.

## Пятая — безліч забаваў

Сёлета на фестывалі запланавана шмат цікавостак не зусім музычнага плану, на самы розны густ. Спартыўная забава басабол — валейбол на пляцоўцы-батуце; тэатр харэографа Гіціса Іванаўскаса, які прадставіць сюррэалістычны свет танга ў пастаноўцы «8 квадратных метраў». Апроч таго, творчае аб'яднанне «Art Forge» вылепіць гліняны горад — копію фестывалю. Любы ахвочы зможа далучыцца да стварэння з гліны скульптураў сябе, свайго намёту ці ўласнага аўтамабіля. А акторы з групы «Trupė Liūdi» наладзяць на фестывальным лузе бутафорскі ЗАГС, дзе закаханыя пары атрымаюць магчымасць адыграць «вяселле». Зрэшты, удзельнікі «Trupė Liūdi» падкрэсліваюць, што да вяселля ставіцца цалкам сур'езна, таму ўсе жадаючыя пашлюбавацца на фестывалі павінны быць дарослымі і ведаць імя, прозвішча і імя па бацьку свайго будучага партнёра па шлюбу.

### Падаць можна на візы да 17 чэрвеня

Для падачы дакументаў у амбасаду кожны квіток трэба зарэгістраваць на сайце **www.b2g.lt.** Падрабязная інфармацыя пра візы на сайце **b2g.soundline.by.**

**Квіткі:** групавыя (ад 4 асоб) — 185 тыс. руб., для студэнтаў — 200 тыс. руб. (па пасведчанні), для астатніх — 250 тыс. руб. У продажы ў грамадскіх распаўсюднікаў, а таксама праз сістэму TicketPro.

**Замова квіткоў і даведка па тэлефонах** (+375 29) 6 5555 96, (+375 33) 6 5555 96.

Бясплатныя візы выдаюцца толькі па набытых у Беларусі квітках.




▸ ГУМАР

# ВЫКРАДЗЕНАЕ СВЯТА

Лёлік УШКІН

**«Не дапусціць, каб у нашага народу выкралі перамогу!» — заявіў адзін вядомы палітык.**

Прасыпаюся, значыцца, зранку. Зараз, думаю, невялікая прабежка на ролікавых лыжах, потым пакашу траву, дам паесці карове. Потым на працу. Трэба будзе абавязкова сёння зрабіць наганяй камусьці. Каму?

Думкі перарваў стук у дзверы. Заходзіць ахоўнік, у руках трымае мой парадны мундзір з вялікімі залатымі зоркамі.

— Нашто? — пытаюся.

У яго вочы адразу круглымі сталі:

— Вы ж самі ўчора казалі, каб да раніцы падрыхтаваў для параду.

Парад? Які парад? Дзіўна, які парад можа быць? Што святкаваць? Дзень працы быццам ужо адсвяткавалі, а да 3 ліпеня яшчэ далёка. Трапілі на вока рознага кшталту прыбамбасы на мундзіры: зоркі, аксельбанты, лампасы. Раптам сэрца брыкнула: «А што калі гей-парад?» Аднак пасля супакоіўся: у такім варыянце абавязкова ў камплекце былі б скураная куртка і хлыст. Я недзе чытаў, што гомасексуалістаў на гэты конт кантроль жэстачайшы.

Аднак праблемы гэта не вырашае. Што за парад? Што за свята? Увогуле, што са мною? Няўжо так і ёсць — першыя сімптомы пачатку той самай мазаічнай хваробы. «Спакойна, спакойна! — кажу сам сабе. — Не падавай знешніх знакаў трывогі».

Адправіўшы ахоўніка, выклікаў сакратара. Гэтаму чалавеку можна давяраць: ён ведае, што ў мяне на яго кампрамат, які ў выпадку чаго на чырвонец пацягне.

— Ну, што, — так асцярожна заходжу збоку, — як там парад?

Чыноўнік рапартуе: народ нагналі, раён ачапілі, самалёты напаўняюць бакі. Усё гатова да дня святкавання...

І тут ён сам асекся.

— Святкавання чаго? — пытаюся.

— А хрэн яго ведае.

Ага, значыць, не толькі ў мяне такая пятрушка з галавою. Ужо добра. Што далей: ехаць на парад, каб чытаць прамову і людзей віншаваць? А з чым? Можна, натуральна, казаць абстрактна — кшталту жыць стала б значна лепш, калі б не розныя Баракі Уладзіміравічы Атунбаевы. Аднак прысмак дыскамфорту адчуваецца. Як ні круці, канфуз відавочны: дзяржава падрыхтавала парад, а сама не ведае, нашто.

— Збірайце, — кажу сакратару, — тэрмінова Саўбез.

Сабралі Саўбез. Сядзім — рэпу чэшам. Ніхто таксама не ведае, з якога ражна святкаваць.

— Пачакайце, — кажа адзін з прысутных, — я калі сюды ехаў, бачыў транспарант — «65 год Вялікай Перамогі».

Ура! Нарэшце хоць нейкая зачэпка. Такім чынам — Перамога. Значыцца, мы кагосьці перамаглі ў 1945-м. Сталі дружна гадаць, каго ж? Калі паглядзець на карту Усходняй Еўропы, то варыянтаў не так шмат. З нашымі рэсурсамі шансаў начысціць пысу ўкраінцам, палякам, а тым больш расіянам няма. Застаецца Літва. Такім чынам, 9 мая 1945-га нашы продкі ўзялі Вільнюс.

— Дарагія суайчыннікі, віншую вас з нагоды перамогі над балтыйскімі акупантамі, — пачаў страчыць тэкст маёй афіцыйнай прамовы спічрайтэр.

Аднак зноў з'явілася нестыкоўка: калі мы ўзялі Вільнюс, чаму аддалі?

Тут у кагосьці прабіла.

— Слухайце, мы ж забыліся, што мы мірныя людзі. А што калі гэта была нейкая ўнутраная перамога? Скажам, над алкагалізмам або там над разгільдзяйствам? Давайце ўзгадаем нейкія бічы грамадства мінулага, якіх зараз няма. Відавочна, адзін з іх мы і ліквідавалі ў 1945-м.

Добрая думка. Прыпыніліся на такой ганебнай з'яве мінулага, як права першай ночы.

Надзеў мундзір і паўтарыў першыя словы свайго выступу: «Дарагія суайчыннікі, віншую вас з нагоды гадавіны канчатковай перамогі нашага народу над практыкай права першай ночы. Феадалізм у нас не пройдзе, нават калі камусьці за акіянам вельмі хочацца нас нагнуць».

Пасля пайшоў забіраць на парад малога.

Заходжу — і што бачу: ён на падлозе гуляецца ў салдацікі. А побач ляжыць канструктар «Наша Перамога над захопнікамі ў Вялікай вайне». Тут усё стала на свае месцы. І парад, і прычына свята.

— Ты нашто скраў нашу перамогу? — пытаюся.

— Ды я не краў. Я так, пагуляцца ўзяў.

Во дае. Дзякуй богу, ён яшчэ не прамяняў на гумкі, або ўвогуле яе не зламаў. Дзе яе пасля рамантаваць? Паклаў перамогу ў больш надзейнае месца — замкнуў у шыфаньер (адсюль малы дакладна не дастане).

І паехаў на парад.

Вось якая дурная раніца выдалася.

Новы Час
Масава-палітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:** 220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214. Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 04.06.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.